Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 279 (3387) Субота 7 сьнежня 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сэкретар—819, кантора—781

ВАРШАВА, 6. БОЛЬШАСЬЦЮ ГАЛАСОЎ СОЙМ ВЫКАЗАЎ УРАДУ СЬВІТАЛЬСКАГА НЕДАВЕРЫЕ. КАМДЭПУТАТЫ НАЛАДЗІЛІ ДЭМАНСТРАЦЫЮ Ў ЗАЛІ СОЙМУ. ДАШЫНСКІ СПЫНІЎ ПАСЕДЖАНЬНЕ.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Прэзыдыум акрпрафбюро пастанавіў паспаць у калгасы ў першую чаргу ня менш 75 рабочых, тэрмінам на 1 год. Выпучэньне таварышоў па прадпрыемствах павінна быць скончана да 1-га студзеня. Выпучаныя рабочыя будуць працаваць у саветах, калгасах і ў якасьці трактарыстых.

Загатоўшчыкі ільну толпяцца на месцы

Канкурэнцыя паміж загатоўшчыкамі зрывае работу

ЗАГАТОЎШЧЫКІ „ЧАКАЮЦЬ"

Да 1-га сьнежня ніякай работы па разгортваньні загатовак ільну па Менскай акрузе з боку загатоўчых арганізацый ня было праведзена. Загатоўшчыкі чакалі, пакуль сельсаветы правядуць работу па давядзеньні пляну да сяла і дадуць ім лёп. Дзякуючы такой пастаноўцы работы, гадавы плян загатовак ільну па Менскай акрузе выкананы ўсяго на 15 проц.

Падрыхтоўчая работа па давядзеньні плянаў да сяла праведзена амаль ва ўсіх раёнах, за выключэньнем Барысаўскага, дзе толькі 27-га лістапада прыступлена да гэтай работы. Кулацкім гаспадаркам даны цьвёрдыя заданьні сельсаветамі і сходамі.

Здача ільну па кантрактацыі праходзіць слабым тэмпам. Сельсаветы часта яшчэ ня ведаюць аб кантрактантах, якія павінны здаваць лён. Загатоўчыя арганізацыі часта не даюць вестак у сельсаветы аб выкананьні кулакамі сваіх цьвёрдых заданьняў.

Наглядаюцца ненармальнасьці ў прэміяваньні здатчыкаў ільну прамтаварамі. Ня гледзячы на агульны недахват прамтавараў на вёсцы, бываюць выпадкі, калі спажывецкая каапэрацыя, у першую чаргу прэміруе толькі тых сялян, якія здаюць лён на пункты спажывецкай каапэрацыі. Зразумела, што такія адносіны да здатчыкаў ільну с.-г. каапэрацыі і Дзяржгандальбелу адбіваюцца на іх загатоўках.

За апошні час наглядаецца, што кулацкія гаспадаркі здаюць у большасьці лён дрэннай якасьці. Ёсьць выпадкі, калі кулакі скупляюць на рынках спэцыяльна лён дрэннай якасьці з тым, каб здаць яго ў каапэрацыю. Лён добрай якасьці кулакі затрымліваюць і не здаюць.

Дзяржгандальбел выканаў толькі 20 проц. пляну

Гадавы плян загатовак ільну па лініі Дзяржгандальбелу выкананы на 1-е сьнежня ўсяго толькі на 20 проц.

Дрэнна абстаіць справа з прамтаварамі для прэміяваньня здатчыкаў ільну. Агенты Дзяржгандальбелу паведамляюць, што ў такіх ільнаводных раёнах, як Полацкая і Магілеўская акругі, адчуваецца вялікі недахват прамтавараў для прэміяваньня здатчыкаў ільну.

Рабоце загатоўчага апарату Дзяржгандальбелу перашкаджае таксама ведамственасьць некаторых устаноў. Так, ёсьць выпадкі, калі каапэрацыя агітуе, каб лён здаваць толькі ёй і ні ў якім разе Дзяржгандальбелу.

У Бабруйскай акрузе некаторыя каапэратары дайшлі да таго, што заяўлялі сялянам, якія прывезьлі лён: «сяляне, здавайце лён толькі нам, мы вас не ашукаем, а яны могуць вас ашукаць». Зразумела, што такія ўзаемаадносіны паміж загатоўшчыкамі перашкаджаюць працы. Ёсьць выпадкі, калі райвыканкомы ня могуць урэгуляваць узаемаадносін паміж асобнымі загатоўшчыкамі і выносяць зусім няправільныя пастановы. Так, напрыклад, Бабруйскі РВК пастанавіў зьняць з рынку загатоўшчыкаў Дзяржгандальбелу.

Трэба адзначыць, што грамадзкасьць і прафсаюзы да апошняга часу ня прымалі належнага ўдзелу ў разгортваньні загатовак ільну.

Для таго, каб з посьпехам выканаць плян загатовак ільну, неабходна ў першую чаргу зьнічыць тую канкурэнцыю, якая мае месца паміж паасобнымі загатоўшчыкамі. Выпадкі прэміяваньня каапэрацыі толькі тых здатчыкаў ільну, якія здавалі лён у каапэрацыю, павінны таксама быць зьнішчаны. Усе здатчыкі ільну, незалежна ад таго, якой-бы арганізацыі яны не здавалі лён, павінны ў роўнай меры атрымліваць прамтавары.

Падрыхтоўка складаў для хаваньня хлеба

Улічваючы памылкі бягучага году, раскіданасьць і адсутнасьць складаў, урадовая камісія запрапанавала Саюзхлебу зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі складаў для хаваньня хлеба ўраджаю будучага году.

Ужо зацьверджана пабудова двух элеватараў у Гомелі і Воршы па 2 мільёны пудоў хлеба. Да будаўніцтва гэтых элеватараў прыступяць яшчэ ў студзені месяцы. Акрамя гэтага, мяркуецца пабудаваць элеватар у Магілеве і Віцебску на 1 мільён пудоў хлеба.

У Бабруйску, Слуцку, Полацку і Гарадку будуць пабудаваны склады, у якіх можна будзе захаваць 500 тысяч пудоў хлеба. Такім чынам Саюзхлеб падрыхтуе да будучага году складаў, годных для хаваньня 5 мільёнаў пудоў хлеба.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ВАРШАВЕ

Дэманстранты разьбілі вокны ў будынку амэрыканскага консульства

ЗГОДНІЦКАЯ „АПАЗЫЦЫЯ" ПАКАЗВАЕ САПРАЎДНАЕ АБЛІЧЧА

ВАРШАВА, 6. 5-га сьнежня вечарам у Варшаве адбылося некалькі камуністычных дэманстрацый. Супроць дэманстрантаў выступала паліцыя. З учарашняга дня яна прыведзена ў баявую гатоўнасьць і ўзброена ручнымі бомбамі. Перад будынкам сойму камуністыя арганізавалі мітынг. Паліцыя разагнала мітынг, ня даўшы камдэпутату скончыць пачатую ім прамову. Бурна праходзіла дэманстрацыя камуністых каля турмы Павіяк, дзе дэманстранты разьбілі вокны ў кватэрах начальніка турмы і турэмнай варты. Адначасова другая частка дэманстрантаў падышла да будынку Амэрыканскага консульства, дзе пабіла вокны ў знак пратэсту супроць спроб Амэрыкі ўмяшацца ў савецка-кітайскі канфлікт. Дэманстрацыя перад будынкамі прэзыдэнта і рады міністраў ня была дапушчана паліцыяй.

У выніку сутычак з паліцыяй шмат зьбітых, некалькі паранена. Паліцыя зрабіла шмат арыштаў.

Поўнае паразуменьне сац.-фашыстых з піл-судчыкамі

ВАРШАВА, 5. Адкрыцьце сэсіі сойму адбылося а 12 гадз. дня. Усе подступы да сойму заняты паліцыяй і шпіцамі (каля Парыжу) у сувязі з прызначаным там сацыялістычным мітынгам «француска-нямецкага зблiжэньня». Забарона была выклікана непакоем ураду, што контр-дэманстрацыя ў Шампані, якую арганізуе кампартыя, прывядзе да сур'ёзных сутычак.

За доўгі час да пачатку мітынгу Шампань быў абкружаны паліцыяй. Каля ўваходу на месца мітынгу сацыялістыя, супольна з паліцыянтамі, дакладна правяралі партыйныя білеты сац. партыі, не прапускаючы «чужых». Ня гледзячы на гэта, некалькі сот камуністых прарваліся на месца мітынгу. Пасьля адчыненьня мітынгу камуністыя і спачуваючыя ім рабочыя перарывалі прамовы сацыялістычных прамоўцаў выклікамі, якія выкрывалі ролю французкай і нямецкай сацыял-дэмакратыі ў задушэньні рабочага руху, яе садзейнічаньні ў падрыхтоўцы вайны і г. д. Паліцыя напала на камуністых. Адбылася сур'ёзная сутычка. Паранена трое рабочых, арыштавана некалькі чалавек. У часе сутычкі група сацыялістых напала ў адным месцы пляцу на дзесятак камуністых і люта іх зьбіла.

****

чыць аб тым, што паміж апазыцыяй і ўрадам зроблена закулісная ўмова і што парляманцкае жыцьцё плыве па «нармальным» русьле. Старшыня сойму Дашынскі гаворыць надта прымірэнчую прамову, складзеную ў надзвычайна асьцярожных выразах. Слова для дакладу па бюджэце даецца міністру фінансаў Матушэўскаму. Зьяўленьне Матушэўскага на трыбуне сустракаецца крыкамі з лавак дэпутатаў левага рабоча - сялянскага блёку: «Фашысты». Дашынскі рэзка заклікае да парадку камуністычнага дэпутата Росяка, які кідае адказ: «Глядзіце, як адзін фашысты абараняе другога».

Камфракцыя ўняла вотум недавер'я Дашынскаму

ВАРШАВА, 6. Сёньняшнае пасяджэньне сойму адкрылася галасаваньнем вотума недавер'я старшыні сойму пэпэсэўцу Дашынскаму. Вотум недавер'я ўнесен камфракцыяй сойму, беларускім рабоча-сялянскім клюбам, сяльробам і сялянскаю партыяй самадапамогі.

У матываваньні вотуму вызначаецца, што Дашынскі запрапанаваў сваё супрацоўніцтва ўраду ў той момант, калі па першым пасяджэньні сойму паліцыя зьбівала ў залі сойму дэпутатаў. Дашынскі рознымі мерамі садзейнічаў фашысцкаму ўраду, калі ён патрабаваў выдачы левых рабоча-сялянскіх дэпутатаў. Дашынскі нязьмена выступае ў якасьці абаронцы імпэрыялісцкае палітыкі Польшчы і ўсямерна падтрымлівае рэжым тэрору і прыгнечаньня ў Зах. Украіне і Зах. Беларусі.

У часе галасаваньня вотуму беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам пакінуў залю пасяджэньня. Усе фракцыі, акрамя тых, якія ўнесьлі вотум недавер'я, галасавалі супроць вотуму. Такім чынам недавер'е Дашынскаму адхілена.

Пасьля гэтага сойм перайшоў да абгаварэньня вотуму недавер'я ўраду.

20 проц. зямельнай плошчы Магілеўшчыны занята калгасамі

Клімавіцкі раён калектывізаваны на 82 проц.

200 рабочых на работу ў калгасы

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Калектывізацыя сельская гаспадаркі на Магілеўшчыне набыла зараз масавы характар. Толькі за апошнія 6 дзён у Чэрыкаўскім раёне арганізаваны два вялікія калгасы — адзін у 25.500 гэктараў, а другі — у 15.000 гэкт. У Крычаўскім раёне поўнасьцю калектывізаваны 4 сельсаветы.

У Клімавіцкім раёне калектывізацыя праведзена да апошняга часу ўжо на 82 проц. У Хоцімскім — звыш 50 проц., у Чэрыкаўскім — на 50 проц. і г. д.

Усяго-ж па акрузе да апошняга часу калектывізавана звыш 20 проц. зямельнае плошчы.

Наглядаецца стыхійнае імкненьне ісьці ў калектывы з боку бядняцка-серадняцкае часткі вёскі.

Рабочыя Магілеўшчыны аказваюць практычную дапамогу ў калектывізацыі вёскі.

Так, акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад у сваёй пастанове па пытаньні калектывізацыі адзначыла, што рабочыя Магілеўшчыны **прымуць усе меры да выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б аб правядзеньні суцэльнае калектывізацыі на Магілеўшчыне на працягу 1929-30 г. Акруговая канфэрэнцыя ўдарнікаў пастанавіла вылучыць 200 рабочых для пасылкі іх на работу ў калгасы.** Некаторыя заводы ўжо прыступілі да практычнага вырашэньня гэтае пастановы. Нядаўна адбыўся сход рабочых заводу імя Лекерта, які пастанавіў паслаць аднаго рабочага па пастаянную работу ў калгас на працягу году. Усе выдаткі па пасылцы і ўтрыманьні гэтага таварыша ў часе яго працы ў калгасе рабочыя ўзялі на сябе.

Рабочыя заводу імя Лекерта выклікалі пасьледаваць іх прыкладу заводы «Спартак», «Ільліч», «Адраджэньне», хлебазавод «Зара», «Зьвязда» і саюзы будаўнікоў і чыгуначнікаў.

Пастанову аб пасылцы 200 рабочых у калгасы вынесла і акруговае прафэсыянальнае бюро. Для выкананьня гэтае пастановы даны адпаведныя ўказаньні па саюзах і на прадпрыемствах.

Па 6 раёнах у калгасы ўступіла звыш 90 настаўнікаў.

У сувязі з масавай калектывізацыяй у акругу павялічылася дастаўка розных сельска - гаспадарчых машын і прылад. Ужо дастаўлена для разьмеркаваньня па калгасах 30 трыераў, 157 картовак, 75 культыватараў, 50 дыскавых барон, 12 трактарных сячкарань і інш. с.-г. інвэнтар.

У практычнае вырашэньне пытаньня аб масавай калектывізацыі ўцягнуты шырокія колы рабочых, беднаты, серадняку і вясковы актыў. Гэта пытаньне будзе абгаворвацца на шырокіх пленумах сельсаветаў з удзелам вясковага актыву.

А. СЯНКЕВІЧ.

Зах. Беларусь і Зах. Украіна пад ботам польскага фашызму

Дэкларацыя Беларускага Сялянска-Рабочага Пасольскага клюбу „Змаганьне", украінскага Сельробу „Еднасьці", камуністычнай пасольскай фракцыі і прадстаўніка „Самапомачы" паспа С. Вайтовіча*)

17-га лістапада арыштаваны сяляне, якія прышлі ў Вільню з мэтаю прынясьці удзел у беларускай сэкцыі краёвага камітэту для падрыхтоўкі міжнароднага сялянскага кангрэсу. Арыштаваны таксама ўдзельнікі делегацыі ў Савецкую Беларусь. У Горадні, Паставах, Маладэчні і іншых мясцох сэкратарыяты беларускага пасольскага рабоча-сялянскага клюбу знаходзяцца пад пастаянным наглядам паліцыі. Шпікі арыштоўваюць асоб, якія прыходзяць у пасольскі клюб, каб не дапусьціць народ да паслоў. Пасольскія мітынгі, як правіла, забараняюцца. Усе спробы выступленьня паслоў перад сваімі выбаршчыкамі канчаюцца паліцэйскімі расправамі. Няма ніводнага пасла з Беларускага Сялянска-Рабочага пасольскага клюбу, які ня быў-бы параненым паліцыяй ці войскам.

Фашысцкая дыктатура праводзіць прымусовую ліквідацыю сэрвітутаў і камасацыю на карысьць абшарнікаў 1 кулакоў. Калі-ж працоўныя беларускія сяляне выступаюць супроць камасацыі, якая аднімае ў іх лепшы кавалак зямлі і сьпіхае да яшчэ горшай нэндзы, дык польскі фашызм адказвае на гэта дзікімі гвалтамі і рэпрэсіямі. Кожная спроба камасацыі ў інтарэсах абшарнікаў і кулацтва становіцца прычынай для праліцьця крыві. Падзеі ў вёсцы Асаўцы, дзе ўся адміністрацыя павету з старостам на чале прымала ўдзел у крывавым прыдушэньні сялян, зьяўляецца штодзённым зьявішчам. У гэтым дапамагаюць польскаму фашызму беларускія здраднікі Ярэміч, Станкевіч, Луцкевіч і Астроўскі, якія прыслужваньнем польскаму фашызму, сваім атуманьваньнем працоўных беларускіх мас, каб адцягнуць іх ад барацьбы за свае правы і інтарэсы, выслугоўваюцца перад прыгнятацелямі і ўдзельнічаюць у гвалтах фашызму над беларускім народам.

Гэтыя паны, дбаючы аб сваіх буржуазных клясавых інтарэсах, падтрымліваюць крывавую расправу польскага абшарніцтва і буржуазіі над беларускімі рабочымі і сялянамі. Адначасова здраднікі праводзяць узмоцненую антысавецкую кампанію.

Беларускія згодніці і сацыял-згодніці шукаюць сабе саюзьніка сярод украінскіх здраднікаў. Маладая буржуазія беларуская і ўкраінская творыць выбарчы блёк, арганізацыйнае аб'яднаньне ў сойме для агульнага выступленьня на міжнароднай арэне. Ундо яскрава падкрэсьлівае ўгоду з польскім фашызмам, выразам чаго быў нядаўні напад УНД'аўцаў на консульства СССР у Львове. Напад гэты выявіў яшчэ раз сапраўдны твар украінскіх згоднікаў, як актыўных саюзьнікаў польскага фашызму ў падрыхтоўцы ўзброенага нападу на Савецкую Украіну і Беларусь.

Аднак, усе спробы буржуазіі і беларускай, украінскай, яўрэйскай ці польскай сацыял-згоды ня могуць стрымаць сацыяльнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўнага народу. Рабочы і селяніп Заходняй Беларусі і Украіны ведае добра, што яго саюзьнікам у барацьбе за сацыяльна-нацыянальнае вызваленьне не зьяўляецца згоднік ці сацыял-згоднік беларускі або ўкраінскі. Працоўны Заходняй Беларусі ўсё выразьней разумее, што толькі супольна з польскім рабочым і селянінам ён здолее скінуць панаваньне агульнага ворага—польскіх капіталістаў і абшарнікаў. Рабочы і селяніп Польшчы ўсё лепш разумее тую праўду, што **«народ, які зьяўляецца катам іншага народу, ня можа быць вольным»**, разумее, што ў яго інтарэсах змаганьне ў братэрскім саюзе з падняволенымі народамі супроць агульнага ворага—панаваньня капіталізму і фашызму ў Польшчы. Штораз больш згуртоўваецца агульны братэрскі фронт барацьбы рабочых і сялян усіх народаў, якія жывуць у сёньняшняй буржуазнай Польшчы, супроць фашызму і капіталізму, супроць згоды і сацыял-згоды, супроць імпэрыялістычнай вайны і нападу на СССР, супроць тэрору і рэпрэсій, за поўную ўладу пралетарыяту, за рабоча-сялянскі ўрад, за зямлю бяз выкупу для сялян, за права самавызначэньня падняволеных народаў, за вызваленьне з-пад прыгону капіталу.

Прэч фашызм і капіталізм.

Няхай жыве барацьба і перамога рабочых і сялян!

Варшава. 24 лістапада 1929 г.

*) Канец. Пачатак гл. № 278.

Адкрыўся першы ўсесаюзны зьезд ударных брыгад

МАСКВА. 5-га ў Калённай залі Дома Саюзаў ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся першы ўсесаюзны зьезд ударных брыгад. Да 5 гадз. вечара заля пасяджэньня перапоўнена. Прысутны лепшыя прадстаўнікі ўдарных брыгад Савецкага Саюзу, а таксама дэлегацыі ад маскоўскіх фабрычна - заводзкіх прадпрыемстваў, партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый.

Зьезд адкрыў сакратар УсеЦСПС **тав. Вэйнбэрг**, які ў сваёй уступнай прамове сказаў: «зьезд ударных брыгад зьбіраецца ў момант палітычнага і эканамічнага росту СССР. Нашы міжнародныя адносіны ўзмацніліся, капіталістычныя краі прымушаны лічыцца з намі, як з вялізарнейшай сусьветнай сілаю. Надзея на тое, што рабочая кляса нашае краіны не патрапіць пабудаваць сацыялістычнага грамадзтва, не апраўдалася. Але на шляху да ажыцьцяўленьня вялізарнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва мы спатыкаем вялікія цяжкасьці, якія выплываюць з эканамічнай адсталасьці нашай краіны. На перамогу гэтых цяжкасьцяў мы мабілізуем працоўныя масы краіны. Ва ўсю шырыню разгарнуўся фронт сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарных брыгад. Ударнікі—рэвалюцыйныя байцы на сацыялістычным фроце, якія перабудоўваюць нашу прамысловасьць і сельскую гаспадарку.

Прафсаюзы абавязаны перабудаваць свае рады, удакладніць мэтады і тэмпы сваёй работы, мабілізаваць новыя тысячы і дзесяткі тысяч рабочых на фронт сацыялістычнага будаўніцтва.

Ад імя УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ, ВСНГ СССР і ЦО партыі «Правда» тав. Вэйнбэрг абвяшчае першы зьезд ударных брыгад адкрытым. У прэзыдыум зьезду выбіраецца 75 чалавек. У ганаровы прэзыдыум пры аднадушных воплесках выбіраюцца т. т. **Сталін, Молатаў, Рудзутак, Калінін, Куйбышаў, Варашылаў, Рыкаў, Томскі, Андрэеў, Баўман, Кагановіч, Кіраў, Касіор, Пятроўскі, Сырцоў, Чубар, Арджанікідзе, Крупская, Блюхэр і Тэльман.** Тав. **Куйбышаву** даецца слова для прывітаньня ад ЦК УсеКП(б) і ўраду, а таксама для дакладу.

— Зьезд ударных брыгад,—кажа тав. Куйбышаў,—вялікае сьвята на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. ЦК УсеКП(б) і ўрад даручылі мне прывітаць у асобе зьезду ўдарных брыгад авангард будаўнікоў сацыялізму ў нашай краіне. Эпоха сацыялістычнага будаўніцтва, якую мы перажываем зараз, характарызуецца вялізарным зрухам у асяродзьдзі рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх пластоў сялянства. Дзякуючы высокай актыўнасьці працоўных мас, мы мелі ў 1928-29 г. вялікія посьпехі, якія паказваюць, што будаўніцтва сацыялізму стала на трывалыя рэйкі і што заканчэньне гэтага будаўніцтва можа быць выканана ў мінімальныя тэрміны.

— Зрушыліся вялізарныя масы пралетарыяту, а пад яго кіраўніцтвам, і сялянскія масы для стварэньня сацыялістычных форм гаспадаркі. Гэта робіць 1928-29 год рубяжом новай эпохі і новых тэмпаў. Ударнікі — прадстаўнікі найбольш сьвядомага атраду рабочае клясы, якія ўступілі на шлях камуністычнае працы, зьяўляюцца авангардам рабочае клясы. У гэтым авангардзе партыя і ўрад бачаць залог посьпеху апошняга бою за сацыялізм.

Пералічваючы асноўныя гаспадарчыя заданьні на 1929-30 год, тав. Куйбышаў кажа, што рабочая кляса абвясьціла барацьбу нявольніцкім тэмпам разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Галоўная галіна народнай гаспадаркі—прамысловасьць—вельмі ўзмацнілася. Рабочая кляса, ацэньваючы свой уплыў на ўсе сфэры дзяржаўнага і гаспадарчага жыцьця, павяла за сабою мільённыя масы сялянства.

Далей тав. Куйбышаў гаворыць, што нашае машынабудаўніцтва ў гэтым годзе перавысіць у 20 раз даваенныя разьмеры. Такія тэмпы сталі магчымымі выключна дзякуючы актыўнасьці і ўзмоцненай ініцыятыве рабочае клясы і асноўных мас сялянства.

Заключную частку свайго дакладу тав. Куйбышаў прысьвяціў задачам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарным брыгадам. Тав. Куйбышаў кажа, што ўступаючы ва ўдарныя брыгады, рабочы становіцца ў авангардзе пралетарыяту, які будуе сацыялістычную грамадзкасьць.

Ад імя ЦК УсеЛКСМ зьезд вітае тав. Косараў. Тав. Косараў перадае пажаданьне, каб наступны зьезд быў зьездам ударных фабрык і заводаў.

Пасьля зьезд заслухаў прывітаньне дэлегацый рабочых заводаў «АМО», «Дынамо», «Серп і Молат», якія знаходзяцца ў пралетарскім раёне Масквы, а таксама прывітаньні ад тав. Баллама, ад выканкому Прафінтэрна і Груміна. (ТАСС).

АБУРЭНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ БССР

супроць спробы ўмяшальнасьці імпэрыялістых у савецка-кітайскі канфлікт

Выступленьне Амэрыкі, Францыі і Англіі з мэтаю ўмяшальнасьці ў савецка-кітайскія перагаворы выклікала хвалю абурэньня сярод працоўных Савецкай Беларусі. Працоўныя ўхваляюць цьвёрды і дастойны тон савецкай ноты —адказ імпэрыялістычным драпежнікам. Учора на фабрыках і заводах Менску і іншых гарадоў Беларусі, у часе абедзенага перапынку і пасьля работ адбыліся шматлюдныя лятучыя мітынгі, на якіх выступаўшыя рабочыя і работніцы выказвалі сваю поўную салідарнасьць з замежнай палітыкай савецкага ўраду і вялікае абурэньне з чыны няпрошпанае ўмяшальнасьці імпэрыялістых.

Рабочыя і служачыя друкарні і рэдакцыі газэты «Зьвязда» ва ўхваленай рэзалюцыі канстатуюць, што перагаворы паміж урадамі СССР і Мукдэнам яшчэ раз пацьвярджаюць імкненьне Савецкага Саюзу да мірнага вырашэньня канфлікту. Спроба ўмяшальнасьці Францыі і Англіі ў нашы перагаворы ў Ніякага пасярэдніцтва імпэрыялістычных акуп нам не патрэбна.

Агульны сход лічыць адказ савецкага ўраду імпэрыялістым правільным.

— Мы адкідаем чыю-б там ні было ўмяшальнасьць у нашыя справы—заяўляюць далей у рэзалюцыі рабочыя і служачыя.

Няхай жыве Далёка-Ўсходняя Чырвоная армія і камандуючы ёю тав. Блюхар!

Агульны сход пастанавіў правесьці збор сродкаў па падпісным лісьце на падарункі Далёка-Ўсходняй.

***

Акрамя гэтага, рэдакцыяй атрыманы рэзалюцыі пратэсту супроць спробы ўмяшальнасьці імпэрыялістых у савецка-кітайскія перагаворы ад **агульнага сходу рабочых друкарні БДВ, ад рабочых і служачых Эльводу, ад агульнага сходу рабочых і служачых Менскай дзяржаўнай абутковай фабрыкі і ад цэлага раду іншых фабрык і заводаў гор.**

Чулае супрацоўніцтва францускіх сацыял-фашыстых з паліцыяй

ПАРЫЖ, 1. Прэм'ер міністар Тардзье забараніў вулічныя дэманстрацыі і паходы з разгорнутымі сьцягамі ў Шампані (каля Парыжу) у сувязі з прызначаным там сацыялістычным мітынгам «француска-нямецкага зблiжэньня». Забарона была выклікана непакоем ураду, што контр-дэманстрацыя ў Шампані, якую арганізуе кампартыя, прывядзе да сур'ёзных сутычак.

Клясавая барацьба пралетарыяту ў краінах белага тэрору

ЗА КРАТАМІ БАЎГАРСКІХ КАТАЎ

На „працэсе 52" у Софіі

АДЭСА, 5. З Софіі праз Канстантынопаль у Адэсу прыехаў камуністычны дэпутат францускага парляманту т. Андрэ Бэртон, які прысутнічаў на працэсе 52 членаў баўгарскай кампартыі.

Бэртон заявіў прадстаўніком савецкага друку наступнае:

— Мне ўдалося дабіцца ад баўгарскага міністра юстыцыі дазволу наведаць цэнтральную Сафійскую турму, дзе знаходзяцца сотні зьняволеных. Я ўбачыў жахлівы малюнак. **Палітычныя зьняволеныя знаходзяцца ў немагчымых умовах: яны разьмешчаны разам з крымінальнымі. Частка з іх прыкавана да сьцен ланцугамі, якія важаць да 12-15 кілё.**

Пасьля пачатку працэсу палітзьняволеныя абвясьцілі аднадзённую галадоўку ў знак пратэсту. За гэта шмат каго пасадзілі ў карцар. Я быў у гэтым карцары. **У пакоі з бэтоннай падлогай і бяз вокан, з дошкамі замест пожкаў, няма нават парашы. Экскрэмэнты змываюцца з падлогі вадою, як у хляве. Страваю зьняволеным служыць кавалак хлеба з вадою.** Пры такіх умовах, зьняволеныя знаходзяцца па масяцы і больш.

Зусім зразумела, што працэс 52—**чарговая камэдыя клясавага суду.** Працэс гэты выклікаў мацнейшае абурэньне з боку баўгарскіх рабочых. Прабуючы ўнікнуць маніфэстацыі на карысьць абвінавачваемых, улада патаемна перанесьла слуханьне працэсу з судовага будынку ў памяшканьне тэхнічнай школы, якая знаходзіцца ў трох кілёмэтрах ад цэнтру гораду.

Падсудныя, ня гледзячы на перанесеныя імі за час знаходжаньня ў паліцыі катаваньні, трымаюцца надзвычайна добра. Асабліваё ўражаньне зрабіла шматгадзінная, яскравая палітычная прамова Младэна Стаянава. Абвінавачаньне цалкам грунтуецца на «прызнаньнях» падсудных, якія зроблены з прычыны катаваньняў. Усе падсудныя на судзе ад гэтых «прызнаньняў» адмовіліся, патрабуючы выкліку сьведак, якія пацьвердзяць малюнак катаваньняў у паліцыі. Суд—па указцы пракурора—адмовіў у выкліку гэтых сьведак. Пракурор патрабуе 1850 год катаргі для ўсіх падсудных.

ПРАСЬЛЕДВАНЬНЕ РАБОЧАГА ДРУКУ

ВЕНА, 1. Як падаюць з Баўгарыі, там аднавіўся выпуск органу Баўгарскай рабочай партыі «Новіні», які быў у свой час забаронены. Першы выпуск газэты з рэдакцыі ў праўленьне паліцыі, ня гледзячы на тое, што пракуратура не дала ніякага загаду аб канфіскацыі газэты.

Рэдакцыя «Навіні» заяўляе, што яна цьвёрда рашыла працягваць выпуск газэты, наперакор канфіскацыі і цэнзуры.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў РАДОМЕ

Як падаюць польскія газэты, ночу з 3 на 4-га сьнежня ў Радоме праведзены масавыя вобыскі. Арыштаваны 21 чал., якіх абвінавачваюць у прыналежнасьці да камсамолу.

30 ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ ВЫКІНУТЫ ФОРДАМ НА ВУЛІЦУ

НЬЮ-ЕРК, 4. На аўтамабільных прадпрыемствах у Дэтройце за апошнія некалькі тыдняў было звольнена 30.000 рабочых. Нядаўна закрыўся цэлы рад аўтамабільных зборачных прадпрыемстваў ва многіх раёнах Амэрыкі.

ЗАБАСТОЎКА ЧЫГУНАЧНІКАЎ У МЭКСЫЦЫ

НЬЮ-ЕРК, 5. Як падаюць з Мэксыкі, рабочыя і служачыя чыгунак, якія належаць ангельцам, абвясьцілі забастоўку. Пачатак забастоўкі мяркуецца 6-га сьнежня.

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ Ў КРАЁХ ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫКІ

МОНТЭВІДЭА, 5. Рост беспрацоўя ва ўсіх краёх Лацінскай Амэрыкі прыймае пагражаючыя разьмеры. Рэвалюцыйная Лацінска-амэрыканская канфэдэрацыя прафсаюзаў пастанавіла правесьці ў лютым месяцы дзень барацьбы з беспрацоўем ва ўсіх краёх Лацінскай Амэрыкі.

ПРАЦЭС 400 РАБОЧАЎ У ЮГА-СЛАВІІ

ВЕНА, 3. Як падаюць з Белграду, юга-слаўскія ўлады падрыхтоўваюць масавы працэс 400 рабочых, якія абвінавачваюцца у прыналежнасьці да кампартыі. Абвінавачаныя знаходзяцца ў зьняволеньні ўжо на працягу 4-х месяцаў. Усіх абвінавачаных у часе папярэдняга зьняволеньня жорстка катавалі і пагаловна зьбівалі.

БАРАЦЬБА АЎСТРАЛІЙСКІХ ГАРНЯКОЎ

ЛЁНДАН, 5. Агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе з Сіднэю (Аўстралія): «У Курыкуры адбыўся сход 4.000 горнарабочых, якія бастуюць. Сход адхіліў згоду, якая была зроблена паміж капальняўласьнікамі і лідэрамі прафсаюзу горнарабочых аб аднаўленьні работы ў капальнях на падставе павялічэньня рабочага дня. **Рашэньне сходу зьяўляецца перамогай рэвалюцыйнага крыла Аўстралійскага прафруху.**

Мяркуюць, што горнарабочыя іншых округ пасьледуюць прыкладу гарнякоў Курыкуры. Рабочыя гэтага раёну пастанаў абвясьціць усеагульную забастоўку гарнякоў ва ўсёй краіне. Забастоўка павінна працягвацца да таго часу, покуль капальняўласьнікі ня згодзяцца на аднаўленьне працы на падставах, якія існавалі да лёкауту».

Увага: Барацьба аўстралійскіх гарнякоў цягнецца ўжо з ліпеня месяца супроць імкненьня капальняўласьнікаў павялічыць рабочы дзень і зьменшыць заработную плату. Гарнякі абвясьцілі забастоўку, на што капальняўласьнікі адказалі лёкаўтам. Пры дапамозе ўраду рабочай партыі была створана нарада прадстаўнікоў капальняўласьнікаў і рэфармісцкіх прафбюкратаў. На нарадзе была зроблена ўмова аб аднаўленьні працы ў капальнях на ўмовах, якія прапанавалі капальняўласьнікі. (ТАСС).

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ БАСТУЮЧЫХ РАБОЧЫХ

АТЭНЫ, 4. Забастоўка студэнтаў і рабочых газавых прадпрыемстваў працягваецца. 4 сьнежня да забастоўкі далучыліся рабочыя і служачыя трамваю, электрычнай чыгункі Пірэй—Атэны, а таксама рабочыя аўтобуснай кампаніі Паўэр.

***

АТЭНЫ, 5. Забастоўка рабочых газавага заводу працягваецца. Пашыраецца таксама забастовачны рух і сярод транспартнікаў. Учора па распараджэньні ўраду пачала працаваць штрэйкбрэхэрская арганізацыя, якая створана з рэакцыйных элемэнтаў студэнцтва, матросаў вайсковага флёту і салдат сапёрных войск. Памяшканьні ўрадавых устаноў, Пірэйская гавань, трамваі і чыгунка ахоўваюцца ўзмоцненымі атрадамі войск. Мясцовая ўлада прыступіла да масавых арыштаў сярод бастуючых. Аднак, ня гледзячы на ўсе рэпрэсіі, бастуючыя трымаюцца стойка і згуртавана.

Учора ў Салоніках адбылася магутная дэманстрацыя студэнтаў, якая была разагнана атрадамі коннай паліцыі і часьцямі пяхоты. Паміж дэманстрантамі і паліцыяй адбыліся сутычкі. 15 чалавек паранена. Хваля забастовачнага руху перакідаецца ў правінцыю.

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА ТРАМВАЙШЧЫКАЎ У ТОКІЁ

ТОКІЁ, 6. Сёньня раніцаю саюз трамвайных рабочых, да якога далучаюцца 13 тысяч чалавек, абвясьціў усеагульную забастоўку ў знак пратэсту супроць рашэньняў Токійскага муніцыпалітэту зьнізіць на 20 проц. прэмію, якая выдаецца ў канцы году. З тысячы трамвайных вагонаў знаходзяцца ў руху толькі 500, якія абслугоўваюцца мабілізаванымі для гэтай мэты канцылярскімі служачымі муніцыпалітэту і служачымі

Дзесяць тысяч савецкіх камбайнаў

Заданьне першага году пяцігодкі завод «Камунар» (Запарожжа) выканаў **на 98,8 проц.** Прадукцыйнасьць працы за гэты год узрасла на 21 проц., **зарплата—на 3,7 проц., сабекошт зьніжаны на 13 проц.**

У другім годзе пяцігодкі завод павінен выпусьціць прадукцыі на 25 мільёнаў рублёў.

У мінулым годзе было выпушчана 25 тысяч штук

В. М. МОЛАТАЎ

АБ КАЛГАСНЫМ РУХУ*)

Нельга забываць, што ў калгасы зараз уваходзіць якая зусім неправыхаваная маса дробных уласнікаў. З гэтага мы павінны рабіць вывад, што ўплыў дробна-буржуазных настрояў, а часамі і просты ўплыў кулацтва ў калгасах, зараз будзе яшчэ вельмі моцным. Барацьбу з гэтымі ўплывамі прыдзецца весьці сур'ёзную і доўгую.

Вакол калгаспага будаўніцтва ідзе самая лютая клясавая барацьба. Кулак ужывае самыя рознастайныя спробы, каб перагарадзіць дарогу калгасам, а дзе гэта не ўдаецца, пралезьці ў калгас і разбурыць яго з сярэдзіны. Элементы клясавае барацьбы ў самых калгасах даюць сябе адчуваць вельмі моцна, і прытым—на кожным кроку. Барацьба з кулацкімі ўплывамі ў калгасах —важнейшая справа і ў гэтым патрэбна вельмі вялікая дапамога звонку, з боку рабочых.

У сувязі з гэтым—два словы аб хістаньнях, якія ёсьць у пытаньні пра дапушчэньне кулака ў калгас.

Хістаньні ў гэтым пытаньні недапушчальны, перш за ўсё таму, што калгасы яшчэ слабыя, яшчэ не пасьпелі стаць на ногі. Дапушчэньне кулака ў цяперашнія калгасы пагражае разлажэньнем многіх і многіх з іх. Але часамі пытаюцца, як-жа быць з кулаком? На жаль, гэта пытаньне ставіць часамі нават тады, калі яшчэ не пасьпелі добра прадумаць асноўнага пытаньня, пытаньня аб тым, як быць з батраком і бедняком і як арганізаваць у калгасе батрацка-бедняцкае ядро. А гэта-ж пытаньне павінна быць першым для арганізатараў калгасаў, якія ставяць справу паралетарску, пакамуністычнаму.

Але трэба адказаць і на пытаньне аб тым, як быць з кулаком. Адказ на гэта пытаньне выцякае з таго, што мы ідзем зараз разгорнутым па ўсім фронце наступленьнем на капіталістычныя элементы. Таму на пытаньне аб тым, як быць з кулаком, мы павінны адказаць: адносься да кулака як да заядлейшага і яшчэ недабітага ворага. Што гэта заядлейшы вораг, аб гэтым напамінаюць нам кожны дзень тысячы і тысячы фактаў кулацкага тэрору, кулацкіх нападаў, падпалаў і забойстваў, нашых работнікаў, актыўных калгаснікаў адданых рэвалюцыі беднякоў і батракоў. Што гэта вораг яшчэ недабіты, аб гэтым таксама гаворыць шматлікія прыклады. Кулак ня спыняе шкодзіць калгасам ня толькі ў адкрытай барацьбе супроць іх, але і пралазячы ў калгасы, а іншы раз і ў органы кіраўніцтва. Таму тыя меры, якія выцякаюць з такіх адносін да кулака, з адносін да яго, як да заядлейшага і яшчэ недабітага ворага, — гэтыя меры будуць правільнымі і вельмі патрэбнымі. Без такіх адносін да кулацтва мы не аўладаем справай калектывізацыі.

Мы ня можам праходзіць і міма такіх фактаў, калі калгасы ня выконваюць элементарных абавязкаў у адносінах да савецкай дзяржавы. Хіба ў нас няма такіх выпадкаў, калі калгасы ня выконваюць заданьняў па хлебазагатоўках? Хіба гэта не зьяўляецца простым зрывам палітыкі савецкай улады? Хіба гэтыя факты не зьяўляюцца выяўленьнем таго, што кулакі, якія пралезьлі ў калгасы, скарыстоўваюць свой уплыў для супроцьстаўленьня калгасаў савецкай дзяржаве? Вось чаму мы павінны гнаць кулакоў з калгасаў і накіраваць як мага больш увагі на арганізацыю батракоў і беднаты, на стварэньне батрацка - беднацкіх груп у калгасах, асабліва ў калгасах прасьпейшага тыпу. Партыя поўнасьцю аўладае кіраўніцтвам калгасным рухам толькі ў тым выпадку, калі будзе праводзіць самую настойлівую работу ў сялянскіх масах і ў саміх калгасах на палітычнай асьвеце беднаты, на падняцьці яе культурнага ўзроўню, на стварэньні кадраў арганізатараў і розных спецыялістых з батракоў і беднякоў. Усе органы пралетарскае дыктатуры павінны накіраваць у гэты бок максымум увагі.

Лідэры правых на гэтым пленуме з асаблівай стараннасьцю расьпісаліся наконт таго, што калгасы зараз зьяўляюцца «вядучым пачаткам» ва ўсёй сельскай гаспадарцы. Але і тут гэтыя няўдачнікі ў палітыцы, з аднаго боку—спазьніліся, а з другога — наблыталі.

Зразумела, калгасы ідуць, як правіла, наперадзе індывідуальнага селяніна ў падняцьці сельска - гаспадарчай вытворчасьці. Інакш-бы ў іх не валіла сялянская маса. Але з таго часу, як калгасы захапілі ў цэлых краінах ад ¼ да ⅓ сялянскіх гаспадарак (Паўночны Каўказ), а заўтра тут у іх будзе ўжо палова сялянскіх гаспадарак і больш, які-ж гэта — «вядучы пачатак»? У гэтым выпадку калгасы таму ўжо ня могуць быць вядучым пачаткам, што ў іх увайшоў ня толькі авангард працоўнага сялянства, але і шырокая маса, а заўтра ўжо і рашаючая — абсалютная большасьць сялянства раёну (краіны). Значыць, разглядаючы пытаньне аб ролі калгасаў з гэтага боку, нельга не прызнаць, што правыя спазьніліся са сваімі дэклярацыямі аб «вядучай ролі» калгасаў.

З другога боку, яны яўна наблыталі. Вядучым пачаткам у адносінах да сельскай гаспадаркі была і застаецца сацыялістычная індустрыя, пралетарыят. Нават зараз, пры вялізарным размаху калгаснага руху, мы не павінны забываць аб гэтым. Мы не павінны распляшчаць у расхлябаных дробна - буржуазных фразах аб калгасах, як «вядучым пачатку», а павінны з усёй акрэсьленасьцю растлумачваць сялянскай масе адно з асноўных бальшавіцкіх палажэньняў: вядучую сацыялістычную ролю ў народнай гаспадарцы вядуць і могуць весьці толькі прадпрыемствы пасьлядоўна - сацыялістычнага тыпу, г.зн. нашы прамыслов. прадпрыемствы і саўгасы. Гэта вынікае з таго, што дзяржаўная ўлада ў нашай краіне знаходзіцца ў руках рабочае клясы, якая апіраецца на вясковую беднату і саюз з сераднякамі масамі вёскі. Нашым абавязкам зьяўляецца бязупынае растлумачэньне працоўнаму сялянству, што толькі на аснове гэтай палітыкі мы да канца і безвяротна ўнікнем небясьпекі адначаленьня капіталізму і забясьпечым перамогу камунізму ў міжнародным маштабе.

Трэба, далей, спыніцца на саўгасах. Вялізарная роля саўгасаў у справе калектывізацыі зразумела. Будаўніцтва саўгасаў і іх посьпехі робяць вялізарны ўплыў на навуковае сялянскае насельніцтва. На прыкладзе саўгасаў сяляне пераконваюцца ў перавагах буйнае сацыялістычнае гаспадаркі. Да таго-ж саўгасы часамі выступаюць у якасьці арганізатараў калгасаў у раёнах, што мяжуюцца з імі. У далейшым гэта роля саўгасаў яшчэ больш павялічыцца.

Але справа ня толькі ў гэтым. Ужо арганізаваным калгасам трэба шмат чаму вучыцца ў саўгасаў, асабліва ў лепшых з іх. Мы проста павінны сказаць, калгасы, у арганізацыі сваёй грамадзкай вытворчасьці раўнайцеся па саўгасах! Мы павінны ўсялякімі спосабамі папулярызаваць думку, што добра арганізаваныя саўгасы павінны быць прыкладам арганізацыі гаспадаркі ў калгасах.

У даны момант асабліва трэба падкрэсьліць ролю саўгасаў у справе падрыхтоўкі кадраў калгасьнікаў, калгасьнікаў-арганізатараў і калгасьнікаў-спэцыялістых. Мы шмат часу трацім на рэзалюцыі і па агітацыю і з-за гэтага часамі мы трацім залаты час. Між тым, зараз для калгасаў галоўнае зусім не агітацыя, а арганізацыйная работа, а вось добрых арганізатараў і спэцыялістых сельска-гаспадарчай вытворчасьці, патрэбных для калгасаў, у нас няма ў запасе. І мы яшчэ да гэтага часу не сьняпаемся з гэтай справай, са справай стварэньня патрэбных кадраў работнікаў калгасаў.

Вось чаму безадкладнейшая задача зьяўляецца выкарыстаньне ўсіх магчымасьцяй падрыхтоўкі новых сіл для калгасаў, між іншым ня толькі для калгасаў, але і для саміх саўгасаў, будаўніцтва якіх мы рушым так шпарка нап... Вось чаму кожны больш-менш ... арганізаваны саўгас мы павінны безадкладна пераўтварыць у школу для падрыхтоўкі новых работнікаў і для перадрыхтоўкі часткі старых работнікаў для калгасаў, дый для саміх саўгасаў. І тут трэба падкрэсьліць, што гэту справу мы павінны разгарнуць тым тэмпам, які патрэбны для падрыхтоўкі падыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі. Зімовыя месяцы, тыдні і дні, што яшчэ засталіся, мы павінны для гэтага скарыстаць з максымальнай энэргіяй. Мы павінны кожны саўгас, а таксама і добра арганізаваны калгас зрабіць школай, дзе будуць падрыхтоўвацца і выкоўвацца работнікі для калгасаў. Нягай гэтым як мага хутчэй зоймуцца кіраўнікі нашых калгасаў і саўгасаў. Пара за гэту справу ўзяцца пабальшавіцку.

Урэшце, аб прамысловых рабочых.

Рэзалюцыя пленуму ЦК прапануе мабілізаваць для калгасаў 25.000 прамысловых рабочых. Гэта надзвычайна важная пастанова пленуму.

Мабілізацыя 25.000 рабочых для вёскі ня можа зусім не адбіцца хваравіта на прамысловых прадпрыемствах. Аб гэтым павінны ўжо зараз думаць таварышы з ВСНГ і УсеЦСПС. І ўсё-ж мы павінны абавязкова на працягу бліжэйшых месяцаў паслаць у калгасы ня менш 25.000 палітычна пісьменных і актыўных таварышоў з фабрык і заводаў. Гэта будзе адным з лепшых прыкладаў падтрыманьня сялянскіх мас з боку рабочае клясы. Гэта дапамога вёсцы мае вялізарнае палітычнае значэньне.

Дадайце сюды пасылку рабочых брыгад, якія накіроўваюцца з гораду для выканаьня асобных заданьняў накшталт правядзеньня хлебазагатовак, рамонту сялянскага інвэнтару і г. д.

Асаблівае значэньне набывае рабочае шэфства над вёскай. Зараз гэта шэфства пачынае набываць новыя формы; заводы і фабрыкі наладжваюць непасрэдную сувязь і шэфства над асобнымі калгасамі; наладжваецца ў розных формах спаборніцтва між рабочымі і калгаснікамі; мэтад сацыялістычнага спаборніцтва пачынае перакідвацца ў шырокія прасторы сялянскіх палёў. Добра было-б дабіцца, каб пасылка 25.000 рабочых у калгасы была арганізацыйна ўвязана з шэфствам рабочых заводаў і фабрык над буйнымі калгасамі і раёнамі суцэльнай калектывізацыі. Змычка рабочае клясы з працоўным сялянствам узмацняецца, становіцца сапраўды непарушнай.

Ня толькі асобныя заводы, але і прафсаюзы ў цэлым зараз павінны вялікую ўвагу аддаць калектывізацыі. Як быццам у гэтых адносінах вызначыўся пералом у лепшы бок. Добра было-б яго замацаваць і рушыць справу наперад.

Вялікая роля Чырвонай арміі ў справе калектывізацыі. На працягу апошніх тыдняў адбываўся і яшчэ адбываецца чарговы асенні выпуск чырвонаармейцаў. Ня мала з іх паехала ў вёску з гарачым імкненьнем да калектывізацыі. Чырвонармейцы ў вёсцы былі, а зараз у асаблівасьці стануць актыўнымі ўдзельнікамі калгаснага будаўніцтва. Мажліва ў далейшым пэўную частку чырвонаармейцаў пасьля сканчэньня тэрміну службы трэба было-б на працягу 2-3 лішніх месяцаў навучаць спэцыяльна таму, што патрэбна для іх, калі яны вернуцца на вёску, на вёску, якая пераходзіць на рэйкі калектывізацыі.

Са сказанага відаць, якая роля сакетаў у калгасным руху. Толькі ва ўмовах савецкага ладу калгасы могуць быць, а пры пэўных умовах пераўтварацца ў рух мільёнаў сялян да сацыялізму. Трэба, каб саветы ўзмацнілі свой кіраўнічы ўплыў у адносінах да калгаснага будаўніцтва. Трэба, каб калгасы сыстэматычна рабілі справаздачы перад саветамі. Бо саветы-ж—асноўнае зьвяно пралетарскае дыктатуры, якое забясьпечвае пераможны рух сялян праз калгасы да сацыялізму. Трэба разам з тым добра ўявіць, што масавая калектывізацыя стварае новую і прытым нячувана моцную базу для саветаў у вёсцы.

Некалькі слоў пра задачы партыйных і камсамольскіх арганізацый у сувязі з калгасным рухам. Месца камсамольцаў—у авангардзе калгаснага руху. Неаволі яшчэ разварушыліся наконт гэтага кіраўнічыя органы камсамолу, а даўно пара! Партыйныя ячэйкі на вёсцы павінны, як належыць, падцягнуцца, каб выканаць адказнейшыя абавязкі кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам. На партыі ляжыць вялізарная адказнасьць і нам патрэбна выкарыстаць усю практыку арганізацыі і кіраўніцтва масамі, каб сапраўды даць кіраўніцтва масамі, каб сапраўды аўладаць кіраўніцтвам калектывізацыяй.

У заключэньне—два словы пра так званыя труднасьці.

Няма чаго гаварыць аб тым, што труд насьці практычнага будаўніцтва калгасаў выключа вялікія. Калгасы пераводзяць дробныя і найдрабнейшыя гаспадаркі на рэйкі буйное грамадзкае вытворчасьці з высокай машыннай тэхнікай. Калектывізацыя вырашае карэнную праблему сацыялізму на вёсцы. Таму нельга перавялічыць тыя сапраўдныя труднасьці, з якімі нам даводзіцца і яшчэ давядзецца тут сутыкнуцца.

Аднак, разважаньнямі пра «труднасьці» іншы раз імкнуцца захаваць апартуністычную баязьлівасьць перад вялізарным сапраўды рэвалюцыйным масавым рухам. З лягеру правых можна зараз нярэдка чуць адкрытыя, а яшчэ больш часта замаскаваныя прапановы наконт таго, ці не прытрымаць гэты рух. Апартуністым заўсёды была ўласьціва баязьлівасьць мас. Гэта баязьлівасьць вынікае з неразуменьня таго, што ўдзел мільёнаў у сацыялістычным будаўніцтве азначае вялізарны рост сіл рэвалюцыі, вялізарны рост творчасьці новых форм грамадзкага жыцьця. Неразуменьне гэтага ўласьціва апартуністым усялякага кірунку, правым і «левым». Гэта якасьць апартуністых зьяўляецца адным з лепшых паказальнікаў таго, што апартуністы можа быць зьвязан з тэй ці іншай групай, з тым ці іншым грамадзкім пластом, але ён адарваны ад масы, адарваны ад рабочых, ад працоўных.

Разважаньні пра «труднасьці», калі яны робяцца для захаваньня апартуністычнага адступленьня, для згортваньня бурнага рэвалюцыйнага руху мас наперад,—чужыя бальшавіком. З такімі настроямі нельга ісьці на чале мас, нельга весьці рабочых і працоўных вёскі да перамогі. Мы павінны правяць рэвалюцыйную чуласьць да цяперашніх настрояў працоўных мас вёскі. Трэба зразумець, што азначае масавы рух у калгасы. Ён азначае, што беднякі і сераднякі ўбачылі, урэшце, сапраўды прасьвет да паляпшэньня свайго жыцьця. Яны ідуць у калгасы, часамі добра не ўяўляючы таго, куды вядзе цяперашні калгасны рух. Яны ідуць у калгасы ў большасьці выпадкаў таму, што бачаць і пераконваюцца, што буйная грамадзкая с.-г. вытворчасьць павышае ўраджайнасьць і пашырае пасевы, палягчае працу і паляпшае матар'яльныя умовы жыцьця працоўных вёскі. Серадняк, а раней яго і бядняк, рынуліся магутным патокам у калгасы не таму, што яны ўжо сталі сьвядомымі сацыялістымі, а таму, што яны ўбачылі выйсьце,—а часамі яшчэ толькі прасьвет да выйсьця,—з жабрацтва, з катаржнае працы, з векавое вясковае дзікасьці. Разам з тым, гэты рух у калгасы паказвае пералом у настроях сялянскіх мас: ад давер'я да саветаў, як улады працоўных, серадняк пераходзіць да давер'я савецкай уладзе, як будаўніку сацыялізму. Дзякуючы ўсёй палітыцы савецкай улады, дзякуючы матар'яльным дасягненьням і палітычнай асьвеце, якія мы маем за 12 год пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, перад працоўнымі вёскі ўсё больш раскрываюцца абмежаваныя магчымасьці разьвіцьця дробнае гаспадаркі, і разам з тым ужо становяцца зразумелымі мільёнам іх пераваг буйной сацыялістычнай вытворчасьці. Вось адкуль ідзе такое рашучае імкненьне сялянскіх мас у калгасы.

Гэтыя настроі батракоў, беднякоў і сераднякоў на вёсцы ў шмат чым чужыя правым ухілістым, якія адарваны ад сапраўдных мас і нават не адчуваюць іх. Ім бліжэй апартуністычныя сумненьні і антырэвалюцыйнае бяльвер'е мяшчан, яны—у палоне дробна-буржуазных настрояў. Мяшчанам з «камуністых» не зразумець бяднацка-сераднацкай масы, якая рынулася ў калгасы, але і гэтая маса, якая рашучая стала на шлях рэвалюцыйнай ломкі «векавых падпор» сялянскае гаспадаркі, не зразумее іх. Хто, як не беднякі і сераднякі, бачаць і кожны дзень сустракаюць на сваім шляху найвялікшыя труднасьці будаўніцтва калгасаў? І ўсё-ж труднасьці калгаснага будаўніцтва не прыпыняюць сялянскую масу, а загартоўваюць яе волю і павялічваюць патрабаваньні да кіраўнікоў, да савецкай улады, да партыі. Адказам на труднасьці, што сустракаюцца на шляху калгаснага руху, можа быць толькі ўзмоцненая ўвага рабочае клясы да гэтае справы. Вялікая дапамога сіламі, узмоцненае падтрыманьне вёскі практычнымі арганізатарамі і палітычнымі кіраўнікамі. Калі сустракаеш таварышоў, якія прыяжджаюць з вёскі, з калгасаў і саўгасаў, што будуюцца, то бачыш, што многія з іх зараз пераўтвараюцца. Часта гэта тыя людзі, у якіх іменна цяпер загарэліся вочы вераю ў перамогу. Армія будаўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі зараз шпарка расьце, прабуджаюцца тысячы, дзесяткі і сотні тысяч новых творчых сіл у народных масах. Гэтыя новыя сілы моцна цэмэнтуюць будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

У заключэньне, напомню тое, што пісаў Ленін у пляне брашуры «Аб харчпадатку» ў 1921 годзе, пры пераходзе да НЭП'у: «10-20 год правільных адносін з сялянствам і забясьпечана перамога ў сусьветным маштабе (нават пры зацяжным пралетарскіх рэвалюцый, якія растуць), інакш 20-40 год пакут белагвардзейскага тэрору» (Ленінскі зборнік, IV, стар. 374).

Мы жывем на трынаццатым годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі. З пакаланага Леніным 10-20-гадовага тэрміну мы пражылі ўжо больш паловы. Масавасьць калгаснага руху з выключнай сілай паказвае, што мы сапраўды знайшлі шляхі да наладжаньня правільных узаемаадносін з сялянствам. Ня гледзячы на мільён труднасьцяй і мільён хібаў у нашай рабоце, мы пераможна ідзем наперад. Ускіненае мільённай сялян у калгасны рух гаворыць аб тым, што на шляху, якім мы ідзем і з якім усё мацней сплятаецца рэвалюцыйны ўзадым мас у капіталістычных краінах,—нам забясьпечана перамога ў сусьветным маштабе.

*) Канец. Пачатак глядзі ў № 278 «Зьвязды».

Яшчэ аб тэорыі „мірнага ўрастаньня яўрэйскага нэпмана і кулака ў сацыялізм"

У нашым апошнім артыкуле («Зьвязда», № 272 ад 29-XI «Яўрэйская нацыяналістычная рознастойнасьць «тэорыі мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм») мы паказалі, між іншым, таксама на т. Буніна, як на выразьніка «тэорыі мірнага ўрастаньня яўрэйскага нэпмана і кулака ў сацыялізм».

Мы ўжо даволі спыняліся на сутнасьці гэтай «тэорыі». Камэнтараў больш непатрэбна. Мы ўсё-ж такі прывядзем «залатыя словы» т. Мар'ясіна адносна сампрамкааапэрацыі. Гэта будзе найлепшым камэнтарам. Вось што т. Мар'ясін казаў на сэсіі савету Белсампрамсаюзу 7-га ліпеня 1929 г.:

«У Беларусі, як і ўсюды, а можа быць, у Беларусі больш, чым усюды, мы маем новыя элементы, якія імкнуцца да нас, як выціснутыя з розных эканамічных пазыцый, якія ўсё далей займаюцца моцнай, шматсыстэмнай каапэрацыяй Беларусі. Усё гэта перад намі ставіць задачы пашырэньня нашай працы. Мы павінны ўзмацніць існуючыя арцелі і арганізаваць новыя. Мы павінны даць адказ на бясконцыя запытаньні новых мас, якія напіраюць на нас».

Аб чым ідзе гутарка ў т. Буніна і Мар'ясіна. Яна, аб упрадкаваньні выціснутых прыватна-капіталістычных элементаў у сампрамкааапэрацыі і ў калгасах.

У гэтым асьвятленьні становіцца зусім зразумелым, чаму тэрмін «цягненьня яўрэяў», «упрадкаваньня яўрэйскага насельніцтва» атрымаў права грамадзянства ў шматлікіх выступленьнях і шматлікіх дакумантах. Гэта справа ня толькі ў няправільных словах, як гэта прабуюць прадставіць правыя апартуністы і прымірэнцы. У гэтым тэрміне знайшла свой адбітак «тэорыя», якая панавала ў галовах гэтых таварышоў. У гэтым ня можа быць ніякага сумненьня.

Возьмем, напрыклад, выбраныя наўгад некалькі выступленьняў т. Бэйліна.

На пасяджэньні савету нацыянальнасьцяй у сьнежні 1928 г. ён кажа: «Прымаючы над увагу цяжкае эканамічнае становішча яўрэйскага насельніцтва, якое мы зараз маем у гарадох і мястэчках, асабліва, у сувязі з паміншэньнем прыватнага гандлю, з паступленьнем каапэрацыі, дзяржаўнага гандлю і г. д. на прыватны гандаль—мы павінны над гэтым пытаньнем сур'ёзна задумацца» (газ. «Эмэс», № 285 8-XII—28 г.).

Амаль што ў гэты-ж час ён на 1-ым усебеларускім зьезьдзе АЗЕТ'у ў сваіх выступленьнях гаворыць пастаянна аб «цягненьні яўрэйскага насельніцтва гораду і мястэчка, дэклясаваных мас у дзяржаўную вытворчасьць», « аб цягненьні яўрэйскіх мас» і г. д. Таміжа т. Бэйлін гаварыў:

«Аб упрадкаваньні на зямлю на сёнешні дзень. Таварышы пыталіся тут, патрэбна ўцягваць саматужніка і працоўнага ў зямляробства, ці дэклясаванага. Адна з важнейшых задач на сёнешні дзень—гэта ўцягнуць абядніўшага гандляра ў зямляробства. Я не прапаную, каб на сёнешні дзень мы бралі такіх, якія яшчэ гандлююць і ўцягвалі іх у старыя арганізаваныя калектывы, дзе ёсьць людзі, якія ўжо там замацаваліся. Мы павінны браць пласты сярэдніх або дробных гандляроў, якія ўжо пакінулі гандаль, і старацца, каб ім далі зямлю і сродкі для пераходу іх на зямляробства ў калектыўныя формы».

Ці гэта ўсё выпадкова. Ясна, што невыпадкова. Тав. Бэйлін ставіць перад намі заданьне ў першую чаргу ўцягнуць былога гандляра ў калгасы і г. д. Тав. Бэйлін гаворыць аб цягненьні сярэдніх гандляроў. Тав. Бэйлін гаворыць аб «цягненьні» ўсяго яўрэйскага насельніцтва. Цяпер зразумела, чаму тав. Бэйлін—былы кіраўнік яўўюро ЦК КП(б)Б—ні адным словам не ўпамянуў на гэтым-жа зьезьдзе АЗЕТ'у пра клясавую барацьбу, якая абвастраецца зараз у нашай краіне, пра барацьбу з нэпманам і кулаком, пра адпор імкненьням клясавага ворага пралезьці ў калгасы і саматужныя арцелі, пра ачышчэньне ад іх (нэпманаў і кулакоў) калгасаў, арцеляй і г. д. Ясна, што мы тут маем справу з разважаньнямі, падобнымі да права-апартуністычных і нацыяналістычных «тэорый» т. т. Буніна, Мар'ясіна і г. д., і г. д.

Тое-ж самае трэба сказаць таксама адносна т. Варана.

У канцы красавіка г. г. (7 месяцаў таму назад) т. Баран, выступаючы на мітынгу, сказаў наступнае:

«Эканамічная палітыка савецкай улады—вядома. Яна даволі вострая і ясная і павярнуць кола назад нікому не ўдасьцца. Кола гісторыі пойдзе далей, каб выціснуць людзей, якія займаюцца гандлем або жывуць ад непрацоўных заняткаў, яны будуць выціснуты са сваіх эканамічных пазыцый. Сацыялістычныя элементы ўзмацняюцца і, зразумела, што з узмацненьнем сацыялістычных элементаў павінны быць выціснуты прыватныя элементы. Тады ставіцца пытаньне: куды ўцягнуць гэтае насельніцтва, каб яно стала прадукцыйным і прынясло карысьць сабе і краіне. Так ставіць пытаньне савецкая ўлада і Камуністычная партыя (стэнаграма, зьмешчанная ў газ. «Акцябр», № 94 ад 26-IV—29 г.).

Проста, ясна і агульна-даступна.

Па сутнасьці мы ўстаноўку гэтых таварышоў разабралі ў ранейшым артыкуле. Устаноўка гэтых таварышоў—гэта права-апартуністычнае і нацыяналістычнае скажэньне лініі партыі па ўцягненьні яўрэйскай беднаты, у першую чаргу, працоўнай у вытворчую працу. Гэта на практыцы азначае спаўзаньне з партыйна-клясавай лініі на рэйкі нацыяналізму і «адзінага яўрэйскага народу»

Лік такіх выступленьняў можна памножыць. Але для захаваньня ісьціны мы павінны адзначыць, што гонар «пальма пярэшынства» ў распрацоўцы гэтай тэорыі належыць маскоўскім таварышом «з пэнтру», кіруючым ва ўсесаюзным маштабе яўпрацай, напрыклад, т. т. Чэмярынскаму, Мэрэжыну і інш. Як адпавядае «таварышом з пэнтру», яны далі найбольш закончаны, найбольш яскравы выраз гэтай «тэорыі». Яны-ж гэта зьяўляюцца бацькамі і стваральнікамі гэтай «тэорыі». Аб т. Чэмярынскім мы ўжо гаварылі. Тут мы прывядзем толькі адзін такі «ўзор» з дакладу т. Мэрэжына ў сьнежні месяцы 1926 году. Ён зварачаецца да нэпманаў, кулакоў і іншых з такім заклікам:

«Савецкая ўлада заяўляе: дзьверы і вароты адчынены для прыкладаньня сваёй працы і капіталу, можаш іх уклясьці ў вытворчую працу, у сельскую гаспадарку» (даклад на 1-м усесаюзным зьезьдзе АЗЕТ'у).

Што гэта? Гэта заклік да нэпманска-кулацкага капіталістычнага разгулу ў сельскай гаспадарцы і г. д. Гэта заклік махровага яўрэйскага нацыяналістага і правага апартуністага.

Гэтымі-ж таварышамі быў высунуты нацыяналістычны лёзунг «яўрэйскай краіны».

Трэба рашуча ўдарыць па гэтых бацькох правага апартунізму і нацыяналізму ў яўпрацы.

ЯНСКІ.

Нацыянальная абмежаванасьць у працы яўсэктару БАН

Аб працы акадэміі наогул многа гаварылі і пісалі, але вельмі мала пісалі пра яўсэктар акадэміі, пра тыя недахопы і памылкі, якія былі ў яго працы.

Перш за ўсё, калі мы гаворым аб недахопах яўсэктару, трэба адначыць, моманты, і вельмі выразныя, нацыянальная абмежаванасьці. Супрацоўнікі яўсэктару вельмі мала ведаюць і цікавяцца тым, што робіцца ў акадэміі наогул, яшчэ менш ведаюць іншыя супрацоўнікі акадэміі аб тым, што робіцца ў яўсэктары. Яўсэктар—гэта «самастойная рэспубліка» ў акадэміі. Яго памылкі застаюцца «паміж сабою».

Пратаколы, пастановы пішуцца ці пісаліся да апошняга часу выключна па-яўрэйску, так што калі хто-небудзь, ня ведаючы яўрэйскай мовы, хацеў-бы нешта праверыць пра яўсэктар, ён нічога зраўмець ня мог-бы.

Тыя-ж навуковыя пытаньні, якія распрацоўваюцца акадэміяй наогул, як напрыклад, агульныя пытаньні мовы, гісторыі ці этнаграфіі, вырашаюцца яўсэктарам без якога-б там ні было фактычнага кантакту з адпаведнымі агульнымі ўстановамі акадэміі.

Характэрна пры гэтым паступнае, што гэта нацыянальная абмежаванасьць яшчэ мае сваё тэарытычнае апраўданьне, яна хаваецца пад штандартам... інтэрнацыяналізму. Так, сярод некаторых супрацоўнікаў адчуваюцца (праўда, ў замаскаванай форме) падобныя настроі, што нам з «імі» (справа ідзе аб спэцыялістых беларусох) няма чаго раіцца і кантактаваць, бо яны нацыяналістыя, а мы зьяўляемся інтэрнацыяналістымі.

Гэта форма маскаваньня яўрэйскага нацыяналізму наогул характэрна для поўнай часткі яўрэйскай інтэлігенцыі. Такія-ж настроі мы даволі часта бачым і сярод часткі яўрэйскіх настаўнікаў.

Гэта «тонкая» форма маскаваньня яўрэйскага нацыяналізму найбольш шкодная. Нацыяналістычны гонар хаваецца пад фігавым лісточкам інтэрнацыяналізму. Выццам толькі яўрэйская інтэлігенцыя можа і здольна быць інтэрнацыяналістычнай, гэта яна мае манаполію на інтэрнацыяналізм.

Ня можа быць сумненьняў у тым, што пад гэтым псэўда-левым пакрывалам хаваецца самы горшы нацыяналізм. Хіба-ж гэта не зьяўляецца найбольш выразнай формай недавер'я да працоўных іншых нацыянальнасьцяй? Хіба-ж ня ў гэтым складалася ўся «філёзофія» бундызму, які культываваў нацыянальную абмежаванасьць пад тэй шыльдай, што ён-бы хацеў быць інтэрнацыяналістым, але-ж «яны» (рабочыя іншых нацыянальнасьцяй) гэтага ня хочуць.

Мы падкрэсьліваем, што гэта замаскаваная форма яўрэйскага нацыяналізму ёсьць сярод часткі супрацоўнікаў яўсэктару акадэміі.

Першае—гэта рашуча зьнішчыць нацыянальную абмежаванасьць яўсэктару.

Але-ж ня толькі ў гэтай нацыянальнай абмежаванасьці заключаюцца хворыя бакі ў дзейнасьці яўсэктару. Усе тыя хібы, якія ёсьць у працы акадэміі наогул, так ці інакш, менш ці больш, ёсьць таксама і ў працы яўсэктару.

Возьмем пытаньне аб навуковай пэрыфэрыі яўсэктару. З кім ён зьвязаны, хто зьяўляецца карэспандэнтамі, ня штатным яго апаратам?

Найбольш пачэснае месца тут займаюць «апошнія магіканы» так званай у яўрэйскіх навуковых колах «пантэрбарскай» школы. Гэта—мінулыя пахлебнікі барона Гінзбурга, які ў яўрэйскіх буржуазных колах лічыўся «отцом благодетелем», а ў расійскай гісторыі рэвалюцыйнага руху вядомы, як удзельнік і віноўнік Ленскіх расстрэлаў.

Сярод пэрыфэрыі яўсэктару знаходзім Савула Гінзбурга, які невядомымі шляхамі захапіў у свае рукі архівы яўрэйскіх клясыкаў-пісьменьнікаў і зараз імі спэкулюе.

Усе былі абураны фактам зьмяшчэньня артыкулу Янкі Станкевіча ў запісках акадэміі. А ці ведае грамадзкасьць, што С. Гінзбург таксама друкаваўся ў часопісі «Цайтшрыфт».

Правільна падкрэсьліў тав. Гейлікман у газэце «Эмэс», што пасьля візыту тав. Сосіса ў буржуазнай часопісі «Яўрэйская старына» пасьледаваў контр-візіт Гінзбурга ў «Цайтшрыфт».

Мы тут (сярод гэтай пэрыфэрыі) знаходзім і стаўленьнікаў ленінградзкай сынагогі і сынагогальных колаў у яўр. аддзяленьні публічнай бібліятэкі. Гэта яны шукаюць па сваім гусьце і выбары «каштоўных дакумантаў», прысылаючы іх у Менск для распрацоўкі...

Ужо ня дзіва тое, што гістарычная камісія яўсэктару ўзялася была (накуль не адмянілі) за вывучэньне такой «актуальнай» тэмы, як (слухайце толькі) гісторыя караімаў у Беларусі ў 18-м стагодзьдзі (караімы—гэта рэлігійная сэкта). Ня дзіва—я кажу—тое, што гэтыя дакументы адшукалі ў Ленінградзкім архіве вышэйназваныя карэспандэнты (зразумела, за грошы), а нашы паважаныя гісторыкі за гэта ўхапіліся.

Мы завастраем гэта пытаньне таму, што фактычна гэта пэрыфэрыя дае часамі тон рабоце яўсэктару (распрацоўваюцца ўсе матар'ялы, якія дасыляюць яны з архіваў).

Ня дзіва і тое, што аб гісторыі яўрэйскага рабочага руху ў часопісях яўсэктару акадэміі нічога ня было (акрамі аборніка «Ройтэ Блетэ»). Гісторыкі з яўсэктару і карэспандэнты не маглі адшукаць дакумантаў па яўр. рабочым руху, затое яны вагонамі знаходзяць і зьбіраюць матар'ялы па хасыдызьме, караімах і г. д.

Што характэрна для нацыянал-дэмакратызму ў навуковай працы?—Утварэньне фэтышу «нацыянальнай культуры і навукі». Канкрэтна ў навуковай працы на яўрэйскай мове гэта знаходзіць свой адбітак у буржуазным тэрміне «Хохмае ісроэль».

Што павінен быў зрабіць яўсэктар? Паставіць свае навуковыя «гарматы» супроць гэтага напрамку. Але замест гэтага, ён часткова сам трапіў пад гэты ўплыў. Яго напады супроць буржуазных і рэакцыйных дзеячоў былі не рашучыя, не даволі завострэныя.

Праўда, «Цайтшрыфт» забаронен у Польшчы. Польская цэнзура не прапусьціла яго ў Польшчу. Але, ня гледзячы на гэта, мы можам канстатаваць, што многія артыкулы маглі быць надрукаваны таксама ў Варшаве ці ў Бэрліне, бо яны ня мелі нашага твару.

Мы зараз у акадэміі змагаемся з тэй тэндэнцыяй, што трэба аддзяліць пэрыяд зьбіраньня матар'ялаў ад апрацоўкі іх. Такім чынам, праводзіцца мажнэр, што зьбіраць (і друкаваць у якасьці матар'ялаў) можна ўсё, а апрацоўка потым будзе, гэта другі пэрыяд, які яшчэ прыдзе. Дык вось, калі мы змагаемся з гэтай «тэорыяй», то трэба адзначыць, што гонар адкрыцьця гэтай глыбокай «архівучонай» ісьціны належыць т. Сосісу.

Гэты-ж т. Сосіс, які шукае (паводле яго слоў) сацыяльных супярэчнасьцяй і быццам дае маркскіцкія працы, даў наступную «маркскіцкую» канцэпцыю:

Чаму ў 18-м і 17-м стагодзьдзі так многа вывучалі талмуд і мала займаліся бібліяй?—пытае праф. Сосіс і адказвае—таму, што талмуд зьяўляецца ідэолёгіяй пануючай клясы, а біблія... прыгнечаных мас. Біблія—кажа ён—зьмяшчае ў сабе матывы сацыяльных пратэстаў сялянскіх мас.

Такім чынам, біблія—«рэвалюцыйная культура»

Сама пастаноўка гэтых пытаньняў і яшчэ больш адказы на іх добра паказваюць «марксызм» Сосісаў.

А фальклёрная этнаграфічная праца? Хіба ня было тут культу фальклёру, любаваньня кожным «народным» глупствам?

Хіба мы тут ня мелі друкаваньня спышоцкіх анэкдотаў Іркуцкага клерыкала Бэйліна пад фірмай «народнай творчасьці»?

Хто тут працаваў? Раўрэбе, аб якім пісалі ўжо у свой час, і ня менш в

РЭЧЫЦКІЯ ПРАВАЛЫ

Да чаго даводзіць права-апартуністычная прихтыка

○ Настрої адсталых пластоў рабочых не сустракалі належнага адпору ○ Выхаваўчая праца—на заднім пляне ○ Камуністыя-хвосьцікі ○ Настрої нацыянальнай розьні на фабрыках ○ Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм у выглядзе супраціўленьня беларусізацыі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

На старонках «Зьвязды» наведамлялася ўжо, што на предпрыемствах у Рэчыцы ня ўсё абстаіць добра. Так, у Рэчыцах маюць месца сур'ёзныя прарывы, настолькі сур'ёзныя, што здаецца суджана гэтаму маленькаму гораду стаць нарыцальным імем. Справа асабліва ўскладняецца тым, што гэтыя прарывы мелі месца ў буйнейшых вытворчых парткалектывах Гоменьшчыны.

Вось аб'яднаны калектыў заводаў «Дніпро», «Х-ты Кастрычнік» і фанэрнай фабрыкі. Тут 2.602 рабочыя, з іх 283 камуністыя і 272 камсамольцы.

Гісторыя гэтай партарганізацыі за апошні год—гэта гісторыя грубых скрыў пеньняў партыйнай лініі ў асноўных кардынальных пытаньнях работы.

Барацьба за чыстату генэральнай лініі партыі ня была ўзьнята на прынцыповую вышыню. Ня было выразнай устаноўкі барацьбы на два франты, партыйная маса ня была мабілізавана вакол важнейшых задач унутры-партыйнага жыцьця ў асобныя пэрыяды. Рад важнейшых пастаноў партыі або прапрацаваны ў арганізацыі вельмі павярхоўна, або зусім не прапрацаваны. Да такіх пытаньняў адносяцца пастановы XVI партканфэрэнцыі, верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б. Пытаньне аб ролі пяцігодкі, як сьцягу мабілізацыі пралетарскіх мас, як кардынальнай праблемы нашай рэчаіснасьці, ва ўсю шырыню ня было пастаўлена. Зусім не ўвайшлі ў кола заводзкага парткіраўніцтва такія пытаньні, як сутнасьць і задачы барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і ўсялякімі шавінізмамі. Калектыў зусім прайшоў міма ўсёй напружанай работы КП(б)Б па барацьбе з правымі правага ўхілу ў нацыянальным пытаньні, у рабоце па інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні мас. У арганізацыі не знайшлі ніякага водгуку апошнія фракцыйныя выпазкі правых апартуністых і пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) наконт лідэраў правай апазыцыі. Партыйна-камсамольская арганізацыі прайшлі міма апошніх праяў «левых» наскоку. Мы азнаёміліся з пратаколамі і матар'ялямі работы, з плянамі партбюро за год. Мімаволі проста зьдзіўляешся адсутнасьці ў гэтых матар'ялах разуменьня барацьбы за генэральную лінію партыі, адсутнасьці ўстановак і праверкі прапрацоўкі і ўсьведамленьня важнейшых пастаноў партыі.

І таму ня дзіва, што сярод асобных камуністых маюць месца разыходжаньні лініі партыі па асноўных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва і таму ня дзіва, што асобныя камуністыя ня згодны з лініяй партыі па індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Напрыклад, «партыец» Сувалаў ня згодзен з лініяй партыі ў адносінах да кулацтва, член партыі Кандрацьцеў скардзіцца на харчовыя затрудненьні і бачыць прычыну гэтых затрудненьняў у непасільных тэмпах індустрыялізацыі. Як трэба расцэньваць, як не адыходам ад лініі партыі, адмову 14-ці камуністых падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі? Камуністыя Ўсхопаў, Варона і Канавалаў плятуцца ў хвасьце адсталых настрояў, падтрымліваюць шкодныя разважаньні асобных рабочых наконт таго, што «сялянства непасільна абкладзена». «Быў-бы прыватны гандаль, ня было-б гаспадарчых затрудненьняў» і г. д.

Партыец Казачэнка тлумачыць гаспадарчыя труднасьці «націкам на сялянства», па яго думцы «самакрытыку нельга праводзіць». Ён наогул адкрыта выступае супроць лініі партыі.

Сярод партарганізацыі мае месца неразуменьне сутнасьці правага ўхілу, ёсьць выпадкі, калі ў адно цэлае яднаюцца разуменьні, якія нічога агульнага з правым ухілам ня маюць.

Напрыклад, у агульна-заводзкай газэце «Дніпровец», якая мае 2.000 тыраж, у заметцы пад загалоўкам «Клубок оппортуністов» нерэагаваньне на панскія замашкі загадчыка цэхам кваліфікуецца, як прыміранцтва.

Да праяў правага ўхілу адносяцца таксама самае звычайнае шкурніцтва і непаведваньне сходаў.

Усё гэта сьведчыць аб поўным неразуменьні сапраўднай сутнасьці правааапартуністычнага ўхілу. Вельмі цікава ў гэтым напрамку надрукаваная ў «Дніпроўцы» № 13 пастанова цэх'ячэйкі аб выключэньні з партыі Фіоніна. У падзагалоўку заметкі гаворыцца, што «ячэйка выключыла правага апартуністага Фіоніна». А вось самая пастанова: «Улічваючы, што Фіонін на практыцы праводзіў правы ўхіл, свае асабістыя інтарэсы ставіў вышэй грамадзкіх, не рэагаваў на хваравітыя зьявы, плёўся ў хвасьце адсталай часткі рабочых, вельмі часта прапускаў агульныя сходы, выкрывальных артыкулаў ня прызнаў, а здаваў партыйны білет і працявае лічыць немагчымым правядзеньне генэральнай лініі партыі,—Фіоніна з партыі выключыць».

Мімаволі трэба задаць пытаньне: за што выключан з партыі Фіонін? За правы ўхіл? Тады справа змазана папітычна, бо ня трэба было гаварыць аб ненаведваньні сходаў, шкурніцтве і г. д. У чым Фіонін не праводзіў генэральную лінію партыі? А вось аб гэтым у пастанове нават няма ні аднаго слова. Трэба канстатаваць, што рэдакцыя таксама невыстарчальна разьбіраецца ў сутнасьці пытаньня.

На фоне слабой ідэалёгічнай загартаванасьці, пышным букетам расквітнелі праявы правага ўхілу на практыцы, якія даходзяць часамі да простай здачы клясавых пазыцый ворагу.

На предпрыемстве працуе шмат гадоў цэлая група пазбаўленых права голасу. Частка з іх нават зьяўляюцца членамі прафсаюзу. І бюро і партыйная частка заводакіраўніцтва і фракцыя фабкому добра аб гэтых элемэнтах ведалі, але ніякіх мер ня ўжывалі. Прымірэньцтва да клясава-чужых элемэнтаў дайшло да таго, што нават, калі адпаведныя органы па сваёй ініцыятыве паставілі пытаньне аб зьняцьці лішэнцаў з работы, дык заводзкае парткіраўніцтва пабаялася адкрыта паставіць гэтае пытаньне, пачаўшы шукаць кампрамэтуючых матар'ялаў, каб мець падставу «законна звольніць лішэнцаў»

Наогул засьмечанасьць прадпрыемства «былымі» людзьмі, якія маюць цёмнае мінулае, настолькі вялікая, што клясава варожая група, карыстаючыся спабасьцю кіраўніцтва, здолела аказаць дэмаралізуючы ўплыў на прадпрыемства, распаўсюдзіць сярод рабочай масы антыпралетарскія настрої і г. д.

Асобныя камуністыя дапускаюць яўна правыя ўчынкі, якія нярэдка мяжуюцца з простым супраціўленьнем сацыялістычнаму будаўніцтву. Былі выпадкі адмовы камуністых уступаць ва ўдарныя брыгады. Некалькі партыйцаў адмовіліся прыняць удзел у суботніку на карысьць абароны краіны.

«Раней забясьпечце, а потым кажэце аб спаборніцтве»—вось як ставіць пытаньне адзін «партыец». Пры абмеркаваньні прамфінпляну асобныя партыйцы супярэчылі супроць намечаных лічбаў з прычыны іх «нерэальнасьці».

Партарганізацыя не змагла выклікаць адпаведнага ўздыму рабочай масы ў справе сацыялістычнага спаборніцтва, ня гледзячы на тое, што ўсе ўмовы для гэтага былі.

Шматлікія выпадкі простага хвасьцізму камуністых, падтрыманьне поглядаў самых адсталых груп рабочых, выразна сьведчаць аб памылках і праталах партыйнага кіраўніцтва. Ня дзіва таму, што сацыялістычнае спаборніцтва дала мізэрныя вынікі і па асноўных паказальніках намечаныя лічбы ня выкананы.

Рад камуністых не заўважае, правільней, ня хоча заўважыць тых вялізарных эканамічных і сацыяльных зрухаў, якія зараз ёсьць у галіне аграмаджаньня вытворчых працэсаў. Гэтыя камуністыя больш прыхільна адносяцца да дробнага буржуа, да індывідуальнага абагачэньня. Звыш 25 камуністых пабудавалі ўласныя дамы, прычым некаторыя ўжо ў 1929 годзе. Характэрна, што гэтыя домаўласьнікі, якія часамі зьяўляюцца кватэраздатчыкамі, складаюцца ў большасьці з тых камуністых, якія адмовіліся падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. І гэта ў той час, калі асобныя работы пры зарплаце ў 90-100 руб. падпісалі да 500 руб. што сьведчыць выразна аб энтузіязьме асноўнай масы рабочых фабрыкі, аб тым, што ў масе сваёй рабочыя правільна разумеюць і ажыцьцяўляюць тыя задачы, якія ставіць партыя і рабочая кляса.

Усе гэтыя зьявы да самага апошняга часу сустракалі прымірэнчыя адносіны з боку партбюро і бюро цэх'ячэек і не знаходзілі патрэбнага адпору ў партарганізацыі.

Адсутнасьць увагі і сыстэматычнай барацьбы з усялякага роду «левымі» наскокамі і рэцыдывамі трацкізму прывяла да такога становішча, што сярод асобных груп рабочых, вельмі і вельмі невялічкіх, спатыкаюцца настрої, якія моцна пахнуць контр-рэвалюцыйным трацкізмам. У адным цэху 10 чалавек рабочых выступілі «Хопіць на нас выжыдаць. На мускулы садзіцёся».

Падобнага роду разважаньні можна сустрэць сярод асобных партыйцаў. Так, Кандрацьцеў лічыць савецкую ўладу «ненадзейнай сьцежкай». Другі камуніст ня згодзен з палітыкай зарплаты, даючы яўна трацкісцкую аргумэнтацыю сваіх «поглядаў».

Да галоўных недахопаў заводзкага парткіраўніцтва трэба аднесьці тое, што вывучэньню гэтых усіх настрояў не аддавалася патрэбнай увагі, не рабілася адпаведных вываду, ня прымалася своячасова належных мер барацьбы з імі.

Антыпралетарскія настрої, пад уплывам агітацыі клясава-чужых элемэнтаў, што аселі на прадпрыемстве, пры адсутнасьці належнага ім адпору з боку партарганізацыі, знаходзілі распаўсюджаньне сярод адсталых груп рабочых.

Так, напрыклад, 10-12 чалавек, зьвязаныя з вёскай, ня выйшлі на суботнік, арганізаваны для збору сродкаў на пабудову трактара падшэфнаму сельсавету.

Рабочыя, якія маюць гаспадаркі, бязумоўна адбіваюць кулацкія жаданьні і надзеі, кажучы: «У нас кулакоў няма», выступаючы супроць калгасаў, тлумачачы спажывецкія труднасьці нявернай палітыкай у адносінах да сялянства

Мелі месца выпадкі цэхаўшчыны, рвацтва. Ёсьць такая думка, каб прадпрыемства камплектаваць толькі «мясцовым» рэчыцкім насельніцтвам. Да «чужых», напрыклад, гомельскіх былі выпадкі самых варожых адносін.

Цкаваньне на гэтай глебе работніцы Ламаносавай *, паслужыла адным з нямалаважных прычын яе самагубства.

Клясавы вораг выступіў і пад нацыянальнай маскай. Злачынна-нядбайныя адносіны кіраўніцтва да пытаньняў нацыянальнай палітыкі слабая тэарытычная ўзброенасьць арганізацыі ў гэтай галіне, слабасьць работы па інтэрнацыянальным выхаваньні мас прывялі да таго, што сярод адсталых рабочых, а часткова і ў партарганізацыі, ёсьць нацыянальная варожасьць. Антысэмітызм дайшоў да дзікіх і адкрытых форм сваёй гэтага праяўленьня. Ходкай фразай было «жыдоўская морда», «жыдамі» часамі адкрыта лаюць яўрэяў. Былі і выпадкі фізычных зьдзекаў: пляваньне ў твар, бойкі. 15-га лістапада работніцу Лібкіну поччу выналі з інтэрнату і выкінулі не ложак і рэчы. У хуткім часе найбольш заядлыя антысэміты стануць перад грамадзкім судом.

Нацыянальная варожасьць праяўляецца ў выглядзе яўрэйскага шавінізму. Эпітэты наконт «хамаў», «мужыкоў», «польская кроў» і г. д., а таксама плёўкі ў твар мелі месца з боку асобных рабочых-яўрэяў.

Вялікадзяржаўны і яўрэйскі шавінізм знайшоў сваё праяўленьне і па лініі супраціўленьня беларусізацыі. Гэтае важнейшае палітычнае пытаньне на прадпрыемстве зусім не знайшло ніякага адлюстраваньня ў практыцы парторганізацыі. На партыйным бюро пытаньне аб беларусізацыі за гэты год ні разу не абмяркоўвалася. Фактычна абноўленае зараз парткіраўніцтва стаўіць пытаньне аб беларусізацыі ўпаршыню. Ва ўсім прадпрыемстве нельга нават знайсьці якую-небудзь адзнаку, якая-б у гэй ці іншай меры закранала пытаньне беларусізацыі. Літаральна, на прадпрыемстве вы ня ўбачыце ніводнага лёзунгу, нават ні адной аб'явы на беларускай мове.

Усё справаводзтва і нават справы парткалектыву вядуцца па расійскай мове. Лічыцца зусім нармальным ненаведваньне лекцый па вывучэньні беларускай мовы. Ёсьць нават такія разважаньні, што «існаваньне БССР, як саюзнай рэспублікі, ня прыносіць ніякай карысьці, а толькі павялічвае накладныя выдаткі».

Наогул лінія партыі па беларусізацыі тут яшчэ не знайшла ніякага адлюстраваньня і ажыцьцяўленьня.

* * *

Аб абураючым заціску самакрытыкі, які парадзіў усе вышэй паданыя недахопы, які не даваў магчымасьці своячасова змагацца з гэтымі недахопамі і наогул аб вытворчых прарывах,—раскажам другі раз.

Рэчыца

Б. ПАПОЎ.

*) Аб гэтым пісалі ўжо ў «Зьвязьдзе».

Тав. Ланцуцкі --у Менску

Менскія рабочыя ў асобе т. Ланцуцкага віталі рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны

Учора ўвечары ў Доме Культуры адбылося ўрачыстае пасяджэньне Менскай мопраўскай арганізацыі сумесна з прафактывам, з удзелам тав. Ланцуцкага.

Заля Дому Культуры не змагла зьмясьціць у сабе ўсю вялікую масу рабочых, якія сьпяшалі паслухаць даклад выдатнага рэвалюцыянэра і барацьбіта т. Ланцуцкага.

Урачыстае пасяджэньне адкрывае ад імя Менакрыткому МОПР'у і ЦСПСБ т. Цудзін, які вітае т. Ланцуцкага, як нястомнага барацьбіта і рэвалюцыянэра.

Гучнымі воплескамі сустракаюць працоўныя г. Менску зьяўленьне на трыбуне т. Ланцуцкага, які ў сваёй прамове вітае працоўных Савецкай Беларусі ад кампартыі і ўсіх працоўных Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Тав. Ланцуцкі расказвае аб гэрайчнай барацьбе, што вядзе польскі пралетарыят, ад нячуваным уціску і эксплёатацыі, якімі фашыстаўскі ўрад прабуе задушыць ўсе ўзрастаючую рэвалюцыйную хвалю. У сваёй прамове т. Ланцуцкі падкрэсьлівае цяжкую гэрайчную барацьбу, якую вядзе польская кампартыя. Яго прамова вельмі часта перарываецца гучнымі воплескамі і шматлікімі лёзунгамі «Няхай жыве кампартыя Польшчы», «Няхай жыве т. Ланцуцкі».

Тав. Ланцуцкі заклікае ўсіх працоўных Менску прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве савецкай краіны, усім уступіць у рады МОПР'у і вышэй узьняць сьцяг пралетарскай салідарнасьці.

Тав. Ланцуцкага вітаюць: ад імя прафэсыянальных саюзаў Беларусі—тав. Клімковіч, ад рабочых 1-й друкарні—т. Бурштэйн, ад Чырвонай арміі—тав. Курганаў, ад ф-кі «Акцябр»—тав. Гепер і ад шчотачнай ф-кі—тав. Зарэцкі.

Аднагалосна прымаецца наступная рэзалюцыя:

„«З сталіцы Савецкай Беларусі мы пасылаем гарачае наша братэрскае прывітаньне камуністычнай партыі Польшчы і Заходняй Беларусі і ўсім працоўным, якія змагаюцца супроць польскага фашызму. З вялікай радасьцю мы сустрэлі слаўнага сына КПП, стойкага барацьбіта-рэвалюцыянэра т. Ланцуцкага на нашай савецкай зямлі, дзе будуецца новы сацыялістычны лад.

* * *

5-га сьнежня т. Ланцуцкі выступаў на масавых мітынгах у АВВШ і гарбарні «Бальшавік», дзе яго горача спаткалі рабочыя і курсанты. Рабочыя гарбарні «Бальшавік» пастанавілі ўнесьці 500 руб. у фонд кампаніі зімовай дапамогі, калектыўна ўсім уступіць у МОПР.

6-га сьнежня т. Ланцуцкі выступіў на мітынгах у камвузе і на фабрыцы «Акцябр»

Ц.

БЕЛАПП ганьбіць учынкі Палішчука

(Рэзалюцыя).

1) Заслухаўшы інфармацыю аб літаратурным выступленьні украінскага паэты Палішчука ў часопісі «Авангард» № 3, — сход менскай філіі БелАПП з абурэньнем асуджвае гэты нахабны закід мяшчан ад літаратуры супроць пралетарскай культуры, якую будуюць мільённыя масы пралетарыяту і працоўных савецкай Украіны з усім Саюзам ССР.

2) Сход заяўляе, што выступленьне групы «Авангард» ёсьць яскравае выяўленьне клясава - варожай пралетарыяту ідэолёгіі, Палішчук у сваім выступленьні адмаўляе клясавую барацьбу, што ў умовах нашага рашучага наступу на капіталізм зьяўляецца нічым іншым, як дапамогай клясаваму ворагу, а заява Палішчука аб «нахальстве гораду» ёсьць наглы паклёп на палітыку партыі, на кіраўніцтва пралетарыяту сялянствам. Палішчук сваім літаратурным выступленьнем гаворыць ад імя абываталя і дробнага буржуа, які разлажыўся і ня здолен ні да якога ўдзелу ў творчай працы.

У пэрыяд вялікіх работ па сацыялістычным будаўніцтве гаспадаркі, культуры, быту, — у пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы пралетарыяту і працоўных супроць капіталістычных элемэнтаў у эканоміцы, культуры, — пашлякі з «Авангарду» спіралістых цягнуць чытача ў абывательскае балота, падальш ад удзелу ў клясавай барацьбе і сацыялістычным будаўніцтве, у балота абывательскай пашляціны.

Сход заяўляе, што гэтае выступленьне Палішчука і групы «Авангард» зьяўляецца нічым іншым як зьдзекам над рабочым чытачом і гэтым выступленьнем Палішчук паказаў, што нічога агульнага з пралетарскай літаратурай і культурай ён ня мае.

3) Сход заклікае ўсіх сяброў БелАПП і ўсю савецкую пісьменьніцкую грамадзкасьць да актыўнае барацьбы з усялякай правай клясава варожай пралетарыяту ідэолёгіі на літаратурным фронце, як бы яна ні выступала, — ці пад маскай багемнічыны, ці пад маскай пропаведзі абывательшчыны.

Да перазаключэньня калдагавароў

ДА АПОШНЯГА ТЭРМІНУ ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ 12 ДЗЁН

Даючы адпор рвачом і шкурнікам рабочыя паказваюць прыклад высока-сьвядомых адносін да сацыялістычнай вытворчасьці

Саўгандальслужачыя і камунальнікі яшчэ не пачалі

Два прафсаюзы яшчэ не пачалі калдагаворнай кампаніі. Гэта — саюз саўгандальслужачых і камунальнікі.

У саўгандальслужачых пытаньне аб калдагаворнай кампаніі будзе абмяркоўвацца толькі 9 сьнежня. Тлумачыцца гэта тым, што нядаўна выбранае цэнтральнае праўленьне саюзу яшчэ фактычна не разгарнула работы.

У саюзе камунальнікаў няма начальства. Старшыня ЦП знаходзіцца зараз у Маскве, сакратар праводзіць чыстку апарату, іншыя члены праўленьня таксама не працуюць, такім чынам, няма каму праводзіць калдагаворнай кампаніі.

Пакончыць з марудным тэмпам працы

Прэзыдыум ЦСПСБ для дапамогі нізавым прафсаюзным ячэйкам у правядзеньні калдагаворнай кампаніі вылучыў 57 таварышоў, у тым ліку 4-х таварышоў, якія складаюць брыгаду УсеЦСПС.

На жаль, ня ўсе вылучаныя брыгадзіры выконваюць свае абавязкі. З 57 чалавек толькі 7 правялі сваю работу і ўжо вярнуліся назад. Іншыя або выехалі нядаўна, або выяжджаюць толькі сёньня - заўтра. Вось рад прыкладаў: таварыш Бычэўскі і Баркан з саюзу нархарч выехалі 4-га сьнежня, тав. Арэшка з саюзу мэталістых—таксама 4-га сьнежня, т. т. Тарасэвіч, Юркевіч з саюзу харчавікоў, т. Рэсін — з саюзу друкароў, тав. Калодка — загадчык арганддзелу ЦСПСБ і іншыя выехалі 5-га сьнежня, тав. Клімковіч—загадчык культаддзелу ЦСПСБ — выехаў толькі ўчора і г. д. Зразумела, што дапамога гэтых таварышоў у калдагаворнай кампаніі значна спазнілася і іх позьні выезд паўдар ці прыняце карысьць.

Да гэтага трэба дадаць, што 18 чалавек, якія мабілізаваны па саюзе сельгаслесрабочых, да 15-га сьнежня будуць заняты іншай кампаніяй — ліквідацыяй няпісьменнасьці — і толькі з 15-га возьмуцца за пераазаключэньне калдагавароў на лесарубаў, служачых зямельных устаноў і іншых.

У выніку большасьць вылучаных брыгадзіраў ня прымае амаль пакуль што ніякага ўдзелу ў калдагаворнай кампаніі, або прымае вельмі і вельмі слабы ўдзел. Гэта акалічнасьць ставіць пад пагрозу своячасовае сканчэньне калдагаворнай кампаніі. Прэзыдыум ЦСПСБ павінен прыняць самыя энэргічныя меры, каб надаць калдагаворнай кампаніі больш хуткі тэмп.

Дырэктыва УсеЦСПС ня выконваецца

Згодна дырэктывы УсеЦСПС, прафсаюзныя органы, у тым ліку ЦСПСБ і цэнтральныя праўленьні саюзаў павінны былі рэгулярна інфармаваць вышэйшыя прафорганы аб ходзе калдагаворнай кампаніі. Першая зводка павінна была быць паслана 20 лістапада, другая — 10 сьнежня, трэцюю трэба паслаць 30 сьнежня і апошнюю, якая-б падводзіла вынікі, — 20 студзеня.

Як нашы прафорганы выконваюць гэту дырэктыву? Прэзыдыум ЦСПСБ яшчэ не паслаў ніадной зводкі. Першая зводка будзе прыблізна паслана не раней 10-га сьнежня. Але гэта зводка ня дасьць поўнага малюнку ходу калдагаворнай кампаніі, бо большасьць цэнтральных праўленьняў саюзаў ніякіх вестак аб ходзе кампаніі ня прыслала (за выключэньнем саюзу хэмікаў і саюзу працмастацтва). Некаторыя цэнтральныя праўленьні, як напрыклад, швэйнікі, харчавікі, дрэваапрацоўшчыкі, абяцаюць прыслаць першыя зводкі сёньня-заўтра.

Цікава адзначыць, што па асобных цэнтральных праўленьнях саюзаў ёсьць частка матар'ялаў з прадпрыемстваў аб ходзе калдагаворнай кампаніі, але па розных прычынах (адсутнасьць работнікаў і г. д.) гэтыя матар'ялы ляжаць неапрацаванымі (саюз працаўнікоў паперы, харчавікі, дрэваапрацоўшчыкі і інш.).

Дзе хаваецца прадстаўнік прафсаюзу

24-га лістапада ЦСПСБ атрымаў адносіну фабзаўкому дражджавога заводу «Чырвоная Зара» і выпіску з пастановы агульнага сходу брыгад па праверцы калдагавароў аб тым, што прымацаваны да фабзаўкому для дапамогі ў правядзеньні калдагаворнай кампаніі тав. Марголін ні разу на завод не зьяўляўся.

Трэба праверыць, як наогул выконваюць свае абавязкі таварышы, якія вылучаны для дапамогі нізавым ячэйкам у правядзеньні калдагаворнай кампаніі.

ПА ФАБРЫКАХ і ЗАВОДАХ

Калі будзе падпісаны дагавор?

На заводзе «Энэргія» толькі 2-га сьнежня закончылі падрыхтоўчае выкананьня старога калдагавору. Згодна прафсаюзных дырэктыў, праверка павінна была быць выканана яшчэ ў кастрычніку месяцы. Такім чынам, энэргаўцы спазьніліся на цэлы месяц. На працягу лістапада павінна было адбыцца абмеркаваньне і прапрацоўка новага калдагавору. Але энэргаўцы да гэтай працы яшчэ не прыступілі. Наогул падрыхтоўка да калдагаворнай кампаніі слаба праведзена. Пры праверцы старога калдагавору на сходах прысутнічала толькі 200 рабочых з агульнага ліку 820 чалавек. Калі-ж будзе падпісан новы дагавор? Ня трэба забываць, што апошні тэрмін 20-га сьнежня.

40 проц. другой зьмены ня ведаюць аб калдагаворы

На менскай фабрыцы абутку праверка старога і прапрацоўка новага калдагавору ужо закончаны. Першая зьмена —дзенная—прысутнічала на сходзе, прысьвечаным абгаварэньню дагавору, амаль палкам і актыўна абмеркавала кожны пункт. Другая-ж зьмена—вячэрняя—была ахоплена толькі на 60 проц. Тлумачыцца гэта тым, што сход склікалі ў кепскі час. Зьмена пачынае працаваць з 3-х гадзін, а сход пачаўся ў 1 гадз. дня.

Такім чынам, каля паловы рабочых другой зьмены нічога ня ведаюць аб калдагаворы. Трэба будзе фабкому правесьці дадатковую растлумачальную работу.

Сарвалі сход

На гарбарні «Бальшавік» зараз ідзе прапрацоўка новага дагавору. Прапрацоўка ідзе па цэхах. Добра прайшоў сход хромавага цэху, на якім прысутнічала каля 80 проц. рабочых цэху. Таксама добра прайшлі сходы ў чырвонадубным і жэлятынным цэхах.

4-га сьнежня павінен быў адбыцца апошні сход лаечнага і мэханічнага цэхаў сумесна з дваровымі рабочымі і служачымі. Але замест 200 чалавек зьявілася толькі 80. Тлумачыцца гэта дрэннай падрыхтоўкай да сходу.

Наогул-жа калдагаворная кампанія на «Бальшавіку» праходзіць больш-менш добра. У пачатку кампаніі была склікана агульназаводзкая канфэрэнцыя, потым па цэхах праводзіліся гутаркі з рабочымі, добра асьвятляе кампанію друкаваная газэта «Рабочае Вока».

Аднабокая праверка

Праверка старых калдагавораў у швэйнікаў посіць аднабокі характар. Праверачныя брыгады правяраюць толькі выкананьне дагавору з боку адміністрацыі. Што датычыць таго, як выконвалі свае абавязкі рабочыя—гэта нікога ня цікавіць. Між тым, на швэйных прадпрыемствах (Меншэвік, «Кастрычнік» і інш.) ёсьць рад выпадкаў парушэньняў працдысцыпліны, правіл унутранога распарадку, наглядаецца рост прагулаў, колькасьці браку, нават пракражы і г. д.

Калдагавор зьяўляецца дакумантам двухбаковым, і рабочыя павінны выконваць узятыя на сябе абавязкі таксама шчыра, як гэтага патрабуюць ад адміністрацыі.

Рабочыя масы даюць адпор рвачом

Праверка старых калдагавароў і абмеркаваньне новых на радзе прадпрыемстваў лішні раз даводзіць, што нашы прафсаюзы не вядуць належнай палітыка - выхаваўчай работы з новымі групамі рабочых. Таму на тых прадпрыемствах, дзе ёсьць новыя рабочыя, наглядаецца рад зьявішч адмоўнага характару, якім ня месца на сацыялістычным прадпрыемстве.

Да такіх зьявішч адносяцца і факты рвацтва сярод асобных адсталых рабочых некаторых фабрык і заводаў.

На фанэрнай фабрыцы «Зьвязда», Мазырскай акругі, быў такі выпадак. У часе абгаварэньня праекту новага дагавору асобныя рабочыя, у тым ліку партыйцы і камсамольцы, выступілі з патрабаваньнем павялічэньня заработнай платы да разьмеру, які атрымліваюць менскія рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык». Зразумела, што ні ў якім разе нельга раўняць кваліфікацыю рабочых фанэрных фабрык і мэблевага заводу «Дрэваапрацоўшчык». Калі дадаць, што розьніца паміж стаўкамі 1-га разраду складае ўсяго 3 рублі (36 рублёў і 33), то будзе ясна, што патрабаваньне рабочых фанэрнай ф-кі «Зьвязда» ня мае ніякай падставы. Трэба яшчэ прыняць пад увагу, што ўмовы жыцьця ў Менску і ў Мазырскай акрузе — розныя.

Чым-жа тлумачыцца такое патрабаваньне часткі рабочых фабрыкі «Зьвязда»? Тлумачыцца яно тым, што на фабрыцы зараз працуе каля 300 новых рабочых (з 700 раб.), у якіх яшчэ моцны дробна - ўласьніцкія тэндэнцыі.

Патрабаваньне гэтай адсталай групы рабочых выклікала вельмі гарачыя спрэчкі. Супроць гэтага патрабаваньня выступіў рад сьвядомых старых рабочых, якія правільна адзначалі немагчымасьць ускласьці на прадпрыемства такі цяжар. Большасьцю галасоў патрабаваньне было адхілена.

На Барысаўскай фабрыцы «Камінтэрн» асобныя складзкія рабочыя ў часе абгаварэньня праекту новага калдагавору патрабавалі, каб ім выдалі абавязкова скураныя курткі або гумовыя плашчы. І ў гэтым выпадку агульны сход даў належны адпор рвацкаму патрабаваньню. Зразумела, што складзкім рабочым такая вопратка не патрэбна.

На швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» рабочы Дубоўскі, які працуе на Гофманскім прасе, выступіў з патрабаваньнем, каб яму выдалі спэцабутак, грунтуючыся на тым, што ён працуе на прасе і шмат разоў у дзень націсканае нагою на пэдаль. Зразумела, што ніхто, ні адзін рабочы яго не падтрымаў, бо калі грунтавацца на гэтым, то чаму служачым не выдаваць спэцштаноў? Яны-ж амаль цэлы дзень сядзяць на адным месцы.

На агульна - заводзкай канфэрэнцыі гарбарні «Бальшавік» выступіў з прапановай рабочы Руткоўскі, які, дарэчы, адным з першых адмовіўся ўступіць ва ўдарную брыгаду. Прапанова Руткоўскага зводзіцца да наступнага: пры вылічэньні нормы выпрацоўкі трэба грунтавацца на выпрацоўцы горшага рабочага, а ня лепшага. Гэта, папершае. Падругое, рабочых, якія спазьняюцца, дапускаць на работу. Гэта была яўная вылазка супроць далейшага павышэньня прадукцыйнасьці працы, а таксама супроць працоўнай дысцыпліны, і канфэрэнцыя зусім правільна дала Руткоўскаму рэзкі адпор. Прапанова Руткоўскага пры галасаваньні не атрымала нават ні аднаго голасу.

Яшчэ адзін рабочы выступіў з прапановай на канфэрэнцыі — адпускаць рабочым заводу прадукцыю свайго выробку, г. зн., скуру па сабекошце. Але і гэта прапанова правалілася, хаця за яе выступіла некалькі рабочых.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што асноўная маса рабочых нашых заводаў моцна ўясьніла сабе задачы, якія стаяць перад Савецкім Саюзам наогул і перад кожным прадпрыемствам у пасобку.

Прафсаюзы-ж павінны ўзмацніць палітыка - выхаваўчую работу сярод новых і адсталых груп рабочых, добра пераварыўшы іх у у заводзкім катле. П.

Каапэрацыю на новыя рэйкі

Узмоцнім вытворчае абслугоўваньне калгасаў

Адным з важнейшых пытаньняў у сучасны момант зьяўляецца пытаньне аб узаемаадносінах і ўзаемадзейнасьці спэцыяльных галін сельска-гаспадарчай каапэрацыі і калгаснай сыстэмы. Неабходнасьць выразнага арганізацыйнага яго вырашэньня адчуваецца ўсімі працаўнікамі с.-г. каапэрацыі і калгасьнікамі.

Сёньнішні пэрыяд, пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі з нячуванымі посьпехамі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва ўтварае новыя формы змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства—вытворчыя Каапэрацыя пачынае разьвівацца ў новых больш высокіх формах сваёй працы. На месцы старой каапэрацыі ўзьнікае новая, вытворчая і найбольш выразны від яе—калгасная каапэрацыя.

Пры гэтых новых умовах праца спэцыяльных галін с.-г. каапэрацыі ні ў якім разе ня звужваецца, а наадварот становіцца значна шырэй. Той узровень разьвіцьця прадукцыйных сіл, які мы маем зараз у нашай краіне, высунуў новую больш высокую форму арганізацыі таваразвароту паміж горадам і вёскай, форму, якая ня толькі падпарадкуе рынкавую стыхію плянаваму дзяржаўнаму рэгуляваньню, але і выдіскае яе шляхам усё больш і больш шырокай арганізацыі сацыялістычнага абмену прадуктаў паміж горадам і вёскай.

Кантрактацыя і ёсьць той новы мэтад работы, які павінен стаць асноўным у дзейнасьці спэцыяльных галін с.-г. каапэрацыі. Зусім відавочна, што ў гэтай працы спэцыяльных галін павінен знайсьці свой адбітак працэс ператварэньня с.-г. каапэрацыі ў калгасную каапэрацыю. Гэта значыць спрыяць найбольш шпаркаму ўцягненьню ў існуючыя калгасы і вытворчыя аб'яднаньні навукольнага насельніцтва, найбольш шпаркаму ўзьнікненьню новых калгасаў і вытворчых аб'яднаньняў, іх узбуйненьню і, што асабліва важна, канцэнтрацыі крыніц накапленьня ў калгасным сэктары. Непасрэдным выразнікам правільнага вырашэньня гэтай задачы зьяўляецца ўцягненьне калгасаў і вытворчых аб'яднаньняў калгасьнікамі, непасрэдна апіраючыся на калгасы, або куставыя аб'яднаньні, поўнасьцю ажыцьцяўляючы-б арганізацыйнае і апэрацыйнае абслугоўваньне калгаснага будаўніцтва пад кіраўніцтвам рэспубліканскага Калгасцэнтру.

Аўтаномныя сэкцыі калгасаў трэба арганізаваць зараз-жа пры асноўных спэцыяльных саюзах — Белпаляводсаюзе і малочна-жывёлагадоўчым саюзе. Цэнтральны садова-гародны саюз, які пераважна абслугоўвае калгасы і саўгасы (75 проц. сацыялістычнага сэктару), трэба рэарганізаваць у калгасны спэцыяльны садова-гародны саюз, пры гэтым саюзе спэцыяльная аўтаномная сэкцыі калгасаў не арганізоўваць. Потым такія аўтаномныя сэкцыі калгасаў неабходна арганізаваць пры ўсіх спэцыяльных акруговых паляводчых і малочна-жывёлагадоўчых саюзах.

Што-ж датычыць Магілеўскай акругі, якая пастановай ЦК КП(б)Б абвешчана, як акруга суцэльнай калектывізацыі, дзе на працягу гэтага 1929-30 г. будзе праведзена 100 проц. калектывізацыя, там зараз ужо трэба самым рашучым чынам прыстасаваць увесь савецкі і ў першую чаргу наш каапэрацыйны апарат для выкананьня гэтай вялікай задачы. У Магілеўшчыне патрэбна акруговы паляводчы саюз рэарганізаваць у акруговы калгасны паляводчы саюз і малочна-жывёлагадоўчы саюз—у акруговы калгасны малочны саюз.

Адзіным з важнейшых пытаньня

Па Савецкай Беларусі

Чыгуначнікі -- шэфы над акрфа

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Рабочыя галоўных майстэрняў чыгункі прынялі шэфства над калектывам акрфінаддзелу. Рабочыя вылучылі брыгаду для ўдзелу ў чыстцы апарату. Рабочы Сазонаў вылучаны для работы ў фінаддзел.

Калектыў фінаддзелу падтрымлівае цесную сувязь са сваім шэфам. Насьценгазэты, якія выпускаюцца калектывам акрфа, пасылаюцца ў майстэрні чыгункі, каб азнаёміць рабочых з жыцьцём установы.

1 проц. зарплаты ў фонд індустрыялізацыі

МАЗЫР (наш кар.). Рабочыя мэханічнага цэху лесапільні «Праца» (у Пасталох) пастанавілі на працягу 5-ці год адлічваць штомесячна 1 проц. заработку ў фонд індустрыялізацыі краіны і выклікалі іншыя цэх заводу і ўсе дрэваапрацоўчыя заводы Мазырыншчыны пасьледаваць іх прыкладу.

Ачаг дурману--пад клюб

ДУКОРЫ (наш кар.). Агульны сход працоўных яўрояў м-ка пастанавіў закрыць сынагогу і перадаць памяшканьне пад клюб.

Мясцовы равін Майзель падаў заяву ў сельсавет, у якой піша, што ён катагарычна адмаўляецца служыць рэлігіі і хоча карысная працай зарабляць сабе на жыцьцё.

Напад на старшыню сельсавету

ЧАЧЭРСК (наш кар.). У канцы лістапада стрэлам праз акно хаты паранены старшыня Дудзіцкага сельсавету Чачэрскага раёну (Гомельшчына) **Алесь Сініцкі.** Тав. Сініцкі—камсамолец—бядняк, актыўна і выразна ажыцьцяўляў клясавую лінію на вёсцы, энэргічна праводзіў хлебазагатоўчую кампанію.

Кулакі, западозраныя ў замаху на Сініцкага, арыштаваны.

Забіты вясковы актывісты

ВЯРЭЗІНА (наш кар.). З паляўнічай стрэльбы забіты праз акно ў пасёлку Чырвоны Сад (Вярэзінскі раён) бядняк-актывісты тав. Раманёнак. Тав. Раманёнак актыўна выступаў на сялянскіх сходах за здачу хлебных лішкаў. На месца здарэньня выехала следчая камісія.

Акруговая канфэрэнцыя беднякоў Мазыршчыны

МАЗЫР (наш кар.). Адкрылася акруговая канфэрэнцыя груп беднаты. На канфэрэнцыю прыехала 90 дэлегатаў.

У дакладзе аб 5-ці гадовым пляне сацыялістычнага будаўніцтва па акрузе, заслуханым канфэрэнцыяй, адзначана, што ў гэтым годзе ўжо прыступлена да будаўніцтва вялікага дрэваапрацоўчага камбінату, а таксама запалкавай фабрыкі. У радзе раёнаў будуць пабудаваны электрастанцыі.

Шайка падробшчыкаў квітанцый на хлеб

СМАЛЯВІЧЫ (наш кар.). Выкрыта падробка талёнаў пры прыёме збожжа і бульбы ад сялян у Смалявіцкім спажывецкім т-ве. Фальсыфікацыі талёнаў займаліся памочнік загадчыка базы Драгун Васіль, прыказчыкі Шыраеў, Сташкоў і канторшчыца Берлін. Усяго імі выдана фальшывых талёнаў на 1.450 руб.

Гэтыя злачынцы рабілі подпісы на талёнах, быццам на склад ад сялян атрымана збожжа. Па гэтых фальшывых дакумантах бухгальтэрыя т-ва плаціла грошы, між тым, як на справе збожжа па гэтых талёнах на склад не паступала. Усяго па гэтай справе затрымана 5 чалавек.

Прысуд па справе Гібалевіча

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Пасьля 8-мідзеннага разгляду скончылася справа працаўнікоў Магілеўскага акрэа, якія абвінавачваліся ў растратах, хабарах і іншых злачынствах, аб чым у свой час пісалася ў газэце «Зьвязда». Магілеўскі акруговы суд прыгаварыў былога бухгальтара акрэа **Гібалевіча** за растрату да 10 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем, з паражэньнем у правох на 5 год, з канфіскацыяй усёй маемасьці.

Былы загадчык акрэа Станкевіч за нядбайныя адносіны да работы ў акрэа прыгавораны да 2-х год, па амністыі тэрмін пакараньня яму скарочаны да 6-ці месяцаў умоўна. Бухгальтар акрэа **Лаўрэнцеў** і бухгальтар НКЗБ **Барабеў** прыгавораны да аднаго году зьняволеньня, але па амністыі ад пакараньня вызвалены, сакратар акрэа—на 6 месяцаў з вызваленьнем ад пакараньня па амністыі. 5 чалавек па суду апраўданы.

МЕНСК

Арганізацыя прыгарадных малочных саўгасаў

Белрабсэкцыя распрацоўвае пытаньне аб арганізацыі ў першую чаргу трох буйных прыгарадных малочных саўгасаў. Мэта арганізацыі саўгасаў—забесьпячэньне гарадоў цэльным малаком. Саўгасы будуць арганізаваны пад Менскам, Гомелем і Віцебскам. Пытаньне распрацоўваецца ў тэрміновым парадку з тым, каб да арганізацыі саўгасаў можна было прыступіць у бліжэйшы час.

Белсельтрэст таксама прыступіў да арганізацыі чатырох малочных фэрм у Менскай, Віцебскай і Гомельскай акругах. На Меншчыне будуюцца фэрмы «Тарасава», «Смалявічы», на Гомельшчыне—фэрма «Уваравічы», на Віцебшчыне—«Доўжа».

Фэрмы «Доўжа» і «Тарасава» да 1-га студзеня 1930 г. будуць поўнасьцю забясьпечаны жывёлай. Да канца 1930 г. на кожнай фэрме будзе да 500 галоў жывёлы.

З вясны ва ўсіх фэрмах будзе прыступлена да пабудовы новых абор і сілосных веж (вежы для загатоўкі сочных кармоў).

Будуць таксама пабудаваны новыя дамы для рабочых фэрм.

На пабудову ўсіх 4-х фэрм на працягу 1930 г. будзе затрачана 720 тысяч руб.

14 новых аўтабусных ліній

Што прадугледжвае 5-цігодка Белдартрансу

Белдартранс намеціў разьмеркаваць 5.400 аўтамабіляў, якія будуць атрыманы БССР на працягу пяцігодкі. Саўгасам і калгасам будзе перадана 850 аўтамабіляў, с.-г. вытворчай каапэрацыі 540, спажывецкай каапэрацыі 840, прамысловасьці—480, пошце і камунальным прадпрыемствам—380 і г. д.

Намечана пабудова ў гарадох 12-ці гаражоў. У 16-ці пунктах будуць пабудаваны раённыя майстэрні. На пабудову гаражоў, майстэрань вызначана да 10 мільёнаў рублёў.

Высунуты праект арганізацыі ў Беларусі Белаўтатрансу, які будзе кіраваць аўтатранспартнай справай.

Белдартранс намеціў адкрыць 14 новых магістральных пасажырскіх ліній Менск—Полацак, Менск—Віцебск, Віцебск—Ворша, Віцебск—Смаленск, Магілеў — Ворша, Магілеў — Гомель, Гомель — Чарнігаў і іншыя. Намячаецца адкрыць яшчэ рад прыгарадных і ўнутрыгарадных ліній.

Яшчэ 10 мільёнаў штук цэглы

Рацыяналізацыя вырабу цэглы значна павялічвае выпуск прадукцыі

Белстрамтрэст правёў на 3-яй цагельні рад цікавых рацыяналізатарскіх досьледаў, якія далі дасканалыя вынікі. Устаноўлена, што шляхам правільнай і роўнамернай засышкі, больш дакладнай нагрузкі і выгрузкі цэглы можна зьменшыць час апальваньня з 15-ці дзён, як гэта практыкуецца зараз, да 12-ці дзён.

Пераход на апальваньне на новым мэтадзе па цагельнях Белстрамтрэсту дасьць дадаткова каля 10 мільёнаў штук цэглы ў год. Апрача таго, рацыяналізацыя вытворчасьці палепшыць якасьць цэглы і зьнішчыць брак з 24-20 проц. да 10 проц.

Выклік рабочых друкарні „Зьвязда" прыняты

Рабочыя 1-й друкарні на сваім вытворчым сьвяце пастанавілі прыняць выклік рабочых друкарні «Зьвязда» аб пасылцы рабочых у калгасы. У сваю чаргу рабочыя 1-й друкарні пасылаюць аднаго таварыша для работы ў калгас, тэрмінам на 1 год. Утрыманьне яго бярэ на сябе калектыў друкарні.

Агранамізацыя пачатковых і сярэдніх школ БССР

Наркамасьветы ўнёс у адпаведныя органы праект аграпамізацыі школ. У бягучым годзе мяркуецца абсталяваць агра-лябараторыі і сельска-гаспадарчыя бібліятэкі ў 1.150 пачатковых школах. Ва ўсіх округах адкрываюцца курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў—на 960 чалавек у год. На працягу 4-х год намячаецца рэарганізаваць 70 вясковых сямігодак у школы сялянскай моладзі. Гэтыя школы таксама будуць абсталяваны агра-лябараторыямі і майстэрнямі.

Пабудова новай электрастанцыі ў Менску

Магутнасьць станцыі вызначана ў 12-18тысяч кілёват

Прэзыдыум Дзяржпляну выказаўся за пабудову новай электрастанцыі ў г. Менску, а не на Судобыльскім балоце, як гэта меркавалася раней. Магутнасьць станцыі вызначана ў 12-18 тыс. кілёват. Станцыя праектуецца, як цёплафікацыйная з падачай цеплавой энэргіі прамысловасьці і іншым абанэнтам.

Дзяржплян запрапанаваў безадкладна прыступіць да пабудовы станцыі не пазьней пачатку 1930-31 году і скончыць пабудову на працягу бліжэйшых двух год.

У першую чаргу на станцыі будуць устаноўлены два турбагенэратары па 6.000 кілёват.

У зьвязку з тым, што новая станцыя 75 проц. сваёй энэргіі (цеплавой і электрычнай) будзе падаваць прамысловасьці, праектаваньне і пабудова станцыі перадаецца пад кіраўніцтва ВСНГБ.

Арганізавана таварыства „Белхладабойня"

Савет Народных Камісараў, каб больш пасьпяхова разьвіць апрацоўку і скарыстаньне мясапрадуктаў, пастанавіў арганізаваць зьмешанае акцыянэрнае таварыства пад назвай «Белхладабойня». Акцыянэрамі т-ва зьяўляюцца выключна дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі, у першую чаргу, Наркамгандаль Белкаапсаюз, Беларускі малочна-жывёлагадоўчы саюз і ўсе акрвыканкомы.

Таварыству «Белхладабойня» перадаюцца ўсе бойні, халадзільнікі, каўбасныя фабрыкі, кішачныя заводы, утылізацыйныя і іншыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў акруговых гарадох і падпарадкаваны дзяржаўным, камунальным і каапэрацыйным установам.

У склад таварыства ўвойдзе акцыянэрнае таварыства Белдзяржгандлю з усім сваім актывам і пасывам.

Паскораныя выпускі ў навучальных установах

У гэтым годзе ва ўсіх сярэдніх і вышэйшых прафэсыянальна - тэхнічных навучальных установах адбудуцца паскораныя выпускі 2-х апошніх курсаў. Да 15-га сьнежня адбудзецца паскораны выпуск 5-га курсу Беларускага вэтэрынарнага інстытуту. Да вясны інстытут выпусьціць 4-ты курс.

СПОРТ

Сьвята зімовага спорту

У канцы студзеня 1930 году Менскі акр. савет фізкультуры наладжвае сьвята зімовага спорту. У сьвяце прымуць удзел прафсаюзныя, вайсковыя, школьныя, клюбныя, вясковыя і студэнцкія фізкультурныя гурткі. Сьвята працягнецца каля 5 дзён. У гэтыя дні адбудуцца спаборніцтвы па наступных відах спорту: лыжы, канькі, гімнастыка, французская барба. Адбудзецца лыжны прабег на 10 клм. на прыз імя газэты «Рабочай». Усяго на гэта сьвята зьедзецца каля 400 фізкультурнікаў.

Фізкультура—на раёне

Менскі акрсавет фізкультуры правёў абсьледваньне фізкультурнай работы ў Плешчаніцкім раёне.

Абсьледваньнем устаноўлена, што ніякай канкрэтнай працы па фізкультуры ў раёне не вялося. У самым м-ку Плешчаніцах ёсьць толькі адзін гурток па фізкультуры, у які ўваходзяць батракі, саматужнікі і інш. лікам у 35 чал., з якіх 15 жанчын. Прыняты меры да арганізацыі фізкультурных гурткоў у трох пунктах раёну (Крайск, Горнае і Камень).

ЗА 30-ТЫСЯЧНЫ ТЫРАЖ „ЗЬВЯЗДЫ"

„Таксама я хачу некалькі слоў сказаць аб нашай „Зьвязьдзе". Яе роля ў самакрытыцы вялізная. Яна ня кепска яе разгортвае. У сувязі з пастановамі пленуму, трэба думаць, яна робіць самакрытыку яшчэ больш баявой, якая мацней б'е правага ўхілістага, бюракрата. Трэба больш дапамагаць газэце ў яе рабоце. Трэба значна павялічыць яе тыраж. Трэба падтрымаць пачынаньне Добруша аб выкліку на падпіску на „Зьвязду". Кожны член КП(б)Б павінен выпісваць „Зьвязду"—цэнтральны орган КП(б)Б, павінен дапамагаць ёй у яе рабоце".

(З дакладу т. Гамарніка аб пленуме ЦК КП(б)Б на сходзе Менскага партактыву).

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1930 г.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на год—9 р. 75 к., на 6 мес.—5 р., на 3 м.—2 р. 60 к., на 1 м.—90 к.

ПАРТ'ЯЧЭЙКІ!

Што зроблена вамі па пашырэньні падпіскі на „ЗЬВЯЗДУ"?

Колькі партыйцаў на вашым прадпрыемстве падпісаліся на „ЗЬВЯЗДУ"?

НІ АДНАГО ПАРТЫЙЦА, ЯКІ-Б НЯ ВЫПІСВАЎ „ЗЬВЯЗДЫ"

Пашырэньне лясного факультэту С.-Г. акадэміі

Рэканструкцыя лясной гаспадаркі БССР паставіла перад лясным факультэтам Беларускай с.-г. акадэміі пытаньне аб падрыхтоўцы новых тыпаў лясных спэцыялістых. Сэкцыя лясных працаўнікоў саюзу сельгаслесарабочых выказалася за пашырэньне лясного факультэту і падзел яго на 3 аддзяленьні — лясной гаспадаркі, леса - эканамічнае і леса - тэхналёгічнае. Аддзяленьні ў сваю чаргу падзеляцца на сэкцыі. Высьвятляецца пытаньне аб увядзеньні на лесфаку непарыўнай практыкі.

СУД

Хуліганы з Старажоўкі

6-га кастрычніка каля 8 гадз. увечары вартаўнік чыгункі **Кандрашэвіч** з жонкаю і са сваім прыяцелем Фальковічам варочаліся да хаты. Каля сквэру, што на Старажоўцы, іх акружыла кампанія хуліганаў на чале з вядомым хуліганам-рэцыдывістым **Францкевічам.** Яны пачалі прыставаць да Кандрашэвіча і лаяцца. Зьбіўшы Фальковіча якому ўдалося ўсё-ж такі ўцячы, хуліганы пусьцілі ў ход нажы і парэзалі Кандрашэвіча. На крык апошняга аб дапамозе зьбегліся чырвонаармейцы №-скага палка, якія разам з міліцыянэрамі затрымалі Францкевіча і Васілеўскага. Хулігану Шарамовічу ўдалося ўцячы, затрымаць яго і да гэтага часу не ўдалося. Аблітага крывёю Кандрашэвіча даставілі ў амбуляторыю, дзе і аказалі першую дапамогу.

Усяго на гэтай справе затрымана 5 хуліганаў.

Народны суд 2-га вучастку, які разглядаў гэту справу, прыгаварыў Францкевіча на паўтара гады зьняволеньня, Васілеўскага на адзін год, Міхайлоўскага, Шчаснага і Вайніцкага на 2 месяцы кожнага з заменаю прымусовымі работамі.

Белсамправсаюз зрывае кантрактацыю студэнтаў

Апошні пленум ЦК УсеКП(б) падкрэсьліў усю важнасьць падрыхтоўкі новых сацыялістычных кадраў. Але-ж, як відаць, ня ўсе ўстановы гэта зразумелі. Добры прыклад дае Белсамправсаюз. У той час, калі Белкаапсаюз, ВСНГ і іншыя ўстановы правялі кантрактацыю студэнтаў БДУ, Белсамправсаюз аб гэтым нават і ня думае. Між тым апошняя дзейнасьць Белсамправсаюзу (правы ўхіл у працы БСПС) сьведчыць аб патрэбным аднаўленьні яго штату. Магчыма, што прычынай гэтай маруднасьці зьяўляюцца тыя настроі, якія існуюць у Белсамправсаюзе, што, моў, «беларускіх студэнтаў кантрактаваць ня варта, вось дайце нам маскоўскіх—тых закантрактуем», так сказаў культпрацаўнік Белсамправсаюзу.

Трэба моцна ўдарыць па такіх настроях і прымусіць БСПС зьвярнуць належную ўвагу на падрыхтоўку кадраў

СТУДЭНТ.

Бібліяграфія

ЛІТАРАТУРА ПА МЭЛІЯРАЦЫІ

(Кароткі агляд кніжок, выд. „Сялянскай бібліятэкай" Белдзяржвыдавецтва)

Пытаньні с.-г. скарыстаньня балот і здабычы торфу маюць для Беларусі вялізнае значэньне. І калі да гэтага часу работа гэта не даволі разгорнута, дык галоўнейшай прычынай зьяўляецца адсутнасьць ведаў у шырокіх колах працоўнага сялянства аб асушцы балот, аб далейшай с.-г. апрацоўцы іх і аб прыёмах здабываньня і спальваньня торфу.

Таму трэба вітаць работу Белдзяржвыдавецтва па выданьні спэцыяльнай масавай с.-г. літаратуры, адначасова падыйшоўшы крытычна да таго матар'ялу, які падносіцца чытачу у выдаваных кніжках.

Д. Пракапенка.—«Як палепшыць сенажаць». Выд. БДВ. 1928 г., г. Менск. Стар. 66. Цана 25 кап.

Зьмест: Нашы сенажаці (па стане, паверхні і па веку). Асушка, карчаваньне сенажаці. Асушка, карчаваньне і плітаваньне сенажаці. Першы спосаб палепшэньня сенажаці. Другі спосаб палепшэньня сенажаці. Догляд забалочанай тарфяной сенажаці. Якую траву сеяць на сенажаці. Збожжавая трава. Бабовая трава. Мешаная трава і як яе складаць. Што дае палепшаная сенажаць. Правільнае карыстаньне сенажацямі і догляд за імі. Як весьці работу па сенажаці ў залежнасьці ад складу травы. Што павінны рабіць слабыя, адзінокія гаспадаркі.

Аўтар усебакова і вельмі зразумелай мовай выкладае ўсе спэцыяльныя пытаньні лугаводзтва, тлумачачы прычыны пагоршаньня сенажацяй і спосабы іх палепшэньня. Зазначаюцца спосабы павярхоўнага і карэннага палепшэньня з правільнымі ўказаньнямі па асушцы балотных сенажацяй і іх далейшай апрацоўцы; на малюнках паказаны прылады, якімі робяцца асобныя работы; добра вылажаны разьдзел аб угнаеньні і па характарыстыцы лугавых траў. Заканчваецца кніжка лёгічным і правільным вывадам, — **што сенажаці трэба палепшаць калектывам.**

Да недахопаў кніжкі трэба аднесьці наступнае: мала спасылак на работу Менскай балотнай станцыі, не заўсёды ўдалыя выразы, зусім незразумелыя для сялянства: стар. 12—... прычым вада павінна займаць каля 70-75 процантаў усіх пустых месц у глебе (?)—гэта ня толькі селяніну, але і аграному нічога не гаворыць; стар. 19—трамбоўка лугоў «бабамі» для зьнішчэньня когу вельмі індывідуальнае мерапрыемства. На стар. 32—ужываньне попелу на угнаеньне — вылічэньне процанту спажыўных матэрый у 41 кілёгр., выяўленае ў фунтах недапушчальна; трэба проста паказаць процант у 100 кілёгр. попелу; на стар. 34—пераблытаны меры—і кілёграмы і фунты; на стар. 34-35—дзесяціны і гэктары; малюнкі—26 і 27 няўдалы, стар. 55-56—выкладаньне прыгатаваньня травяных мешанін мала зразумела; стар. 58—зноў разьлікі на дзесяціну і інш. Ня гледзячы на гэтыя недахопы, якія лёгка зьнішчыць у наступным выданьні, кніжку можна з посьпехам рэкамэндаваць чытачу.

Т. Шыбко — «Скарыстаньне балота». Выд. БДВ—1-е ў 1926 г. і 2-е ў 1928 г. бяз зьмен, г. Менск, стар. 57, цана 15 кап.

Трэба дзівіцца—якім чынам такая «універсальная кніжка», самая бясталентная і няпісьменная халтура магла вытрымаць у Белдзяржвыдавецтве два выданьні?.. Нераазуменьне аўтарам трактаванага пытаньня выяўляецца амаль што на кожнай старонцы.

Стар. 7-10—утварэньне балота вылажана няправільна; стар. 10—расьліны дыхаюць карэньнямі (!) — няверна: асушка балота — плятанічная размова, бо ніякіх практычных даных па асушцы, хаця-б Менскай станцыі, аўтар ня прыводзіць. Стар. 16—выкладаньне, што «калі галоўная канава будзе глыбейшай, то вада ў ёй будзе ніжэй,... калі-ж канава галоўная адноль каваи глыбіні з бакавымі, то вада сьцякаць ня будзе, але будзе стаяць у канавах»...—дзіцячая балбатня і няправільнае: калі галоўная канава адноль каваи глыбіні з бакавымі, але мае ўхіл, то вада ўсё-ж з балота сьцячэ і інш.

Для дрэнажу аўтар рэкамэндуе запрашаць «вучонага спэцыялістага», а для асушкі адкрытымі канавамі ён, на яго думцы, непатрэбен (стар. 25).

Стар. 28—упэўненасьць аўтара аб тым, што на «тарфяных глебах» часта бываюць засухі—абсурдная і яшчэ больш абсурдны спосаб барацьбы з гэтай «мнімай» засухай праз навозку глінаў і пяску.

Наогул аўтар ня мае аніякага ўяўленьня аб культуры балот.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

СУБОТА, 7-га сьнежня, спэктакль для саюзу мэдсанпрацы. Білеты ў саюзе. **Ц. Даўгапольскі. Барацьба машын**

НЯДЗЕЛЯ, 8 сьнежня, спэктакль для фабкому швэйнай ф-кі „Кастрычнік" Білеты ў фабкоме. **Д. Бэргельсон. ГЛУХІ** Пачатак спэктакляў роўна а 8 г. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — **Рэйкі гудуць** Звыш праграмы хроніка Белдзяржкіно. Пасьля кожнага сэансу выступленьне **Е. ЛЬВОВАЙ і ДОРЫНА** Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса— ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Нямецкі фільм **Зялёны завулак** драма ў 6 частках. Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 65. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса--ад 5 г.

КІНО Гігант — Новы бытавы фільм вытворчасьці „Совкино" **НА ЗАВАРОЦЕ** Драма ў 6 частках. Звыш праграмы амэрык. арігінальн. камэдыя **ЯНА--ГЭТА ЁН** у 2-х частках. Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Новы фільм савецкае вытворчасьці **МАНІФЭСТ** гістарычна-хронікальная карціна ў 5 частках. Звыш праграмы **ЦЁМНЫ КАНЁК** Амэрыканская камэдыя ў 2 частках. Каса адчыняе ад 2 гадз.

КІНО Спартак — З панядзелка 2 сьнежня звыш праграмы гастролі сатырыкаў-шутоў **Е. І. Ю. Штукаровых** У рэпэртуары-юмар, сатыра злоба дня. На экране—мастацкі фільм **ЗАКОН ГОР** драма ў 8 час. Каса--ад 5 г. Пачатак 1 с. а 6 г. 30 м.

БЕЛСЕЛЬХОЗСНАБУ ПАТРАБУЮЦЦА на сталую працу:

1. Аграном-плянавік.
2. Аграном па тэхдапамозе—машынаназнаўца.
3. Аграном-спэцыялісты па с.-г. машынам і інвэнтару.

АКЛАДЫ ПЭНСІІ ПА ДАГАВОРАНАСЬЦІ.

Зварочвацца ў праўленьне «Белсельхозснабу» г. Менск, вул. Карла Маркса № 36/43.

Да ведама ўсіх АЗЕТ-ячэек, упаўнаважаных і арганізацый па распаўсюджаньні білетаў

2-ой АЗЕТ-ЛЁТАРЭІ ПА г. МЕНСКУ І АКРУЗЕ

8 СЬНЕЖНЯ--АПОШНІ ДЗЕНЬ

канчатковага разьліку за білеты.

Пасьля вызначанага тэрміну білеты ня будуць прымацца і каштоўнасьць іх будзе спагнана з тых асоб і арганізацый, які ўзялі білеты.

Член прэзыдыуму—ГЭРШЭНБАУМ.
Старшыня лётар. камісіі—ДЗІХЦЯР.

Праўленьне Нядзельнага Рабочага Унівэрсытэту даводзіць да ведама слухачоў НРУ, якія

НЕАКУРАТНА НАВЕДВАЮЦЬ ЛЕКЦЫІ,

што ў будучым за ненаведваньне лекцый на працягу 3-х разоў яны

БУДУЦЬ ВЫКЛЮЧАЦЦА з УК-ТУ.

Таварышы з тых прадпрыемстваў, якія перайшлі на бесьперапынны тыдзень, павінны паведаміць аб гэтым праўленьне.

Праўленьне НРУ.

БЕЛАРУСКАЕ Дзяржаўнае Выдавецтва

ВЫШЛА З ДРУКУ

І ПРАДАЕЦЦА ЎСІМІ КНІГАРНЯМІ АКРУГОВЫХ АДДЗЯЛЕНЬНЯЎ БДВ І СЕТКАЙ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ

І. СТАЛІН Год вялікага пералому, СТАР. 23. ЦАНА 5 КАП.

—) гэтымі днямі выходзяць: (— РЭЗАЛЮЦЫІ ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б).

З ДАДАТКАМІ:

інфармацыйнага паведамленьня, заяў на пленуме ды ў ЦК УсеКП(б), перадавіцы з «Правды» «Партыя перамагае» і Пастановы Бюро ЦК КП(б)Б аб прапрацоўцы рэзалюцый пленуму.

З з паловай аркушы.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Менская Акруговая Кантора Сувязі даводзіць да ведама дзяржаўных устаноў, каапэрацыйных і гандлёвых арганізацый і прыватных асоб г. Менску,

што пры названай канторы

АДЧЫНЕН ПАКАЗАЛЬНЫ ПУНКТ

ДЛЯ ЗАПАКАВАНЬНЯ ПАСЫЛАК І БАНДЭРОЛЯЙ

ПА НАСТУПНЫХ ЦЭНАХ:

За запакаваньне і абшыўку і перавязку пасылак у мяккую абкладку, альбо скрынку з фанэры ці кардону цана ад 35 к. да 1 р. 70 к. у залежнасьці ад велічыні пасылкі.

За запакаваньне бандэроляў у паперу—10 кап.

Адміністрацыя Канторы Сувязі.

Прыблудзіўся сабака

Пароды «Понтар», шэрсьці белай вушы жоўтыя, на сьпіне дзе невялічкія жоўтыя плямкі. Праз 3 дні лічу сваім.

Адрас: Койдаваўскі тракт д. № 55

50 к. Кошт публікацыі аб згубе даукментаў

Паведамленьні

Сёньня:

Клюб савецкіх і гандлёвых служачых. У 19 гадзін—вечар для членаў саюзу з дакладам аб кантрольных лічбах на 1929-30 г. і нашых гаспадарчых трудносьцях.

Аб выдачы кніг. З прыч. перавуч. з 5—10 сьнежня бібліятэка Дому Камасьветы спыняе выдачу кніг на дом. Выдача наогул навуковай і грамадзка-палітычнай літаратуры па дом спыняецца.

Дом Асьветы. Заняткі па антырэлігійным сэмінары пераносяцца з 8-га на 9-е сьнежня.

Дом Камасьветы. 1. Кіно «Чаму гэта так» у 7 ч. і камэдыя ў 2 ч. Пач. у 20 і 22 гадз. 2. Ад 19 да 21 гадз. (пак. 23) кансультацыя т. Лур'е па палітэканоміі. Запрашаюцца слухачы сеткі працасьветы і т. т., што займаюцца самаадукацыяй.

Пэдгабінэт. Сход сэкцыі палітэхнічнага выхаваньня ў 19 гадз., заняткі гуртку 130 для дашкольніц у 20 гадз.

А 7-я гадзіне ўвечары ў клюбе імя Розы Люксэмбург адбудзецца **мітынг працоўнага польскага насельніцтва,** на якім з дакладам аб становішчы рабочых і сялян Польшчы выступіць тав. **Ланцуцкі.** Пасьля дакладу—п'еса ў 3-х дзеях «Мяшчанка» ў пастаноўцы польскага вандроўнага тэатру.

СЬПІС ДАКЛАДЧЫКАЎ, ЯКІЯ ВЫЛУЧЫЎ КАСТРЫЧНІЦКІ РАЙКОМ ПАРТЫІ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ КАМПАНІІ

Джалюк—ЦК ЛКСМБ, Ярыцін, Лавоўскі і Вінаградаў — ЦКК КП(б)Б, Ашак—спраўдом, Лібман—Белсельсаюз, Лойка—рабфак, Барсукоў—Хэмфармзавод, Кандрашук—Чырвоны Крыж, Путнін і Цмых — Школа імя Чарвякова, Кардашэнка, Міхайлаў, Гінзбург, Нароенка і Фрыдман—НКЮ, Налякоўскі—абутковая фабрыка, Канаплін, Кірушын, Панкевіч, Клыс і Усьпенскі—ВДУ, Вайтэнка—саюз сельгасрабочых, Цёмкін—УЦ. Дорскі, Міхайлаў і Каласкоў — ДПУ, Галаскок — Камбанк, Хаскін—Белкаапсаюз, Васкабойнікаў—Камбанк, Матусэвіч—Сампрамсаюз, Падольскі—Ашчадная каса, Яршоў—Усекабанк, Кугель — рабфак, Сьмірноў—Калгасцэнтр, Пыжыкаў, Подзін—Белсельсаюз і Фрыдлянд.

Усе гэтыя т. т. павінны зьявіцца 11 сьнежня, а 7 гадзіне ўвечары ў Агітпрапгабінэт клюбу Карла Маркса для кансультацыі па правядзеньні дакладаў на антырэлігійныя тэмы.

Заўтра

Пэдгабінэт. Заняткі гуртку па плянаваньні і па лічэньні для дашкольніц—у 20 гадз., гуртку па грамаце для наст. «0» груп школ—у 20 гадз.

Дом Асьветы. Агульны сход ячэйкі ЛКСМБ Працасьветы—у 19 гадз.

Клюб Нархарч. Чарговы дэлегацкі сход жанаддзелу хатніх работніц—у 15 гадз.

Дэкадны камвуз. Чаровыя заняткі ў памяшканьні камвузу: па гістарычным цыклі—у 18 гадзін (лект. т. Рыўлін); па філёзоўскім цыклі (лект. Галянза): па эканамічным цыклі—ў 19 з паловай гадзін (лект. т. Лур'е).

Бібліятэка клюбу «Чырвоны будаўнік» перайшла на бесьперапынку. Чытачом перарэгістравацца і прынесьці чл. біл. Бібліятэка адкр. з 18-22 гадз.

Адказны рэдактар ЛН. АСЬМОЎ.